**Сяргей Міскевіч**

# Кніга памяці Даўбуцішкі

Першы том з шэрагу друкаваных выданняў, прысвечаных гісторыі, культуры, генеалогіі татараў былога Вялікага Княства Літоўскага. Змяшчае звесткі пра аколіцу Даўбуцішкі - цэнтр сучаснага Смаргонскага раёна – цэнтр найбольшай па плошчы мусульманскай парафіі ў даваенны час, якая, на жаль, на сённяшні дзень ужо знікла з мапаў Беларусі.

Кніга будзе карыснай навукоўцам, што займаюцца татаразнаўствам, а таксама татарам, што шукаюць свае карані. Тут Вы знойдзеце мапы, фотаздымкі, спісы пахаваных на мізарах, генеалагічныя дрэвы і яшчэ шмат чаго цікавага.

Аўтар:
СЯРГЕЙ МІСКЕВІЧ, даследчык татарскай гісторыі і генеалогіі.
muslimbel@mail.ru
Выдавец:
Мусульманскае Рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь
mechet@tut.by , minskmosque@gmail.com

Гісторыя паселішча татараў-мусульман у Даўбуцішках асабліва важная з прычыны некалі вялікага духоўнага значэння дадзенага месца для мусульман Беларусі.

Даўбуцішкі пачынаюць фігураваць у дакументах з 1546 года. З дадзеным месцам звязаны некалькі пісьмовых помнікаў рознай ступені дакладнасці. Некаторыя раннія згадкі паходзяць з Актаў аб літоўскіх татарах, дзе фігуруе "духовник татарский Хаджи Челеби Мурзич", датаваныя 1588 г. З дадзенай фігурай А.А. Мухлінскі атаясамляе аўтара трактата на асманскай мове - "Рысале татар-і-лех", які апавядае пра пілігрымку ў Хадж беларускіх мусульман у 1558 годзе, пераклад якога аўтарам гэтых радкоў быў выкананы сёлета.

Вернікі, якія спачываюць на мізары Даўбуцішкі з'яўляюцца людзьмі высокага саслоўя, і, такім чынам, гэта ўскосна паказвае на важнасць дадзенага мусульманскага прыходу.

Адмысловым прадметам, які прыцягвае пільную ўвагу з'яўляецца шэдэўр драўлянага дойлідства Беларусі - мячэць, пабудаваная ў 1735 г. Дадзены будынак з'яўляецца, у нейкім сэнсе, увасабленнем лёсу беларускіх татараў. Агульны архітэктурны стыль мячэці гарманічна ўбірае ў сябе рысы беларускай народнай архітэктуры, у той жа час, асноўныя элементы будынка нясуць відавочны мусульманскі след. Іншыя культавыя збудаванні на Беларусі не ўяўляюць такой разнастайнасці вялікіх і малых архітэктурных форм. Гэта мячэць унесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад кодам 612Г000407.

Дванаццаціgranны купал гэтай мячэці грунтоўна ўзвышаецца над ансамблем порцікаў і трохкутных франтонаў. Гарызантальна арыентаваныя паўмесяцы як у інтэр'еры так і ў экстэр'еры мячэці тонка паказваюць на стылістычны прыцяг да асманскай а не да паволжскай тэндэнцыі дэкарацыі. Асабліва падкрэсліваюцца анаталійскія рысы ў вітых калонах порціка. Вонкавы выгляд мячэці ўяўляў дынамічны ансамбль які складаўся з прамых і плыўных ліній. Стылістычных аналагаў дадзенай мячэці ў мусульман цэнтральнаеўрапейскага рэгіёна няма, што робіць дадзенае збудаванне выключным у плане сваёй культурнай і гістарычнай каштоўнасці.

Будынак праіснаваў да канца васьмідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя, аднак у выніку адсутнасці належнага рамонту на працягу савецкага перыяду, з прычыны ўрагану, які паваліў векавыя дрэвы на купал, мячэць разбурылася. Ужо на абломках будынка, работнікі "БелСпецПроектРеставрация" падрыхтавалі высакаякасныя чарцяжы будынка, і ў разабраным стане, яна была перавезена ў Беларускі Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту ў в. Строчыцы.

Падчас апытання, праведзенага аўтарам гэтых радкоў, сведкаў разбору будынка, менавіта, былога старшыні абшчыны мусульман г. Іўе - Мустафы Радкевіча, высветлілася, што на момант дэмантажу амаль усе драўляныя элементы будынка меліся ў наяўнасці. Аднак, падчас візіту аўтара ў Музей архітэктуры і побыту ў чэрвені 2019, у прадэманстраваным ангары, дзе

захоўваліся дэталі будынка, высветлілася, што ў наяўнасці засталося не больш за два дзясяткі дошак рознай велічыні.

Нажаль, дадзены бясцэнны помнік знік незваротна. Варта аддаць належнае працаўнікам, якія зрабілі чарцяжы і праектную дакументацыю, дзякуючы якім можна ўзнавіць дадзеную мячэць без якіх бы там ні было адхіленняў ад прататыпа.

Як гэта было раней адзначана, дадзеная мячэць не мае аналагаў у Еўропе і сваім выглядам яна дэманструе ўнікальны гістарычны феномен - арганічнае існаванне на працягу шасці стагоддзяў кампактнага мусульманскага насельніцтва ў еўрапейскай дзяржаве.

На жаль, у наш час мы назіраем няўмольнае знікненне гэтага, бясспрэчна, слаўнага народа - беларускія татары. Выдатныя дзеячы татарскага адраджэння А.-Б. Шабановіч і І.Б. Канапацкі шматразова ўказвалі на прычыну захавання татарскага этнасу на працягу стагоддзяў - татараў захоўваў Іслам. Менавіта рэлігія захоўвала этнас, які прайшоў усе стадыі інтэграцыі, моўнай і культурнай асіміляцыі, а ўжо сёння перажывае апошнюю стадыю знікнення - страту сваёй духоўнай самасвядомасці.

У дадзеных умовах праца Мусульманскага Рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца архіважнай. Аўтарам гэтых радкоў, пад кіраўніцтвам муфтыя Абу Бекіра Шабановіча праведзены шэраг мер па аднаўленні дадзенай мячэці на тэрыторыі музея ў в. Строчыцы. Распрацаваны агульны праект функцыянавання будынка не толькі ў якасці музейнага экспаната, але, што асабліва важна, функцыянавання дадзенага будынка па яго прамым культавым прызначэнні. Плануецца ўзнавіць дадзеную мячэць у адным з самых наведвальных музеяў у Беларусі, каб гэта мячэць стала наглядным дапаможнікам па талерантным выхаванні грамадзян краіны, а таксама, каб яна стала маладзёжным культурным цэнтрам татараў Мінска і вобласці, на базе якой будуць праводзіцца духоўна-асветніцкія мерапрыемствы, на адраджэнне татара-мусульманскай самасвядомасці.

Адным з важных крокаў у гэтым напрамку з'яўляецца публікацыя дадзенай кнігі. Гэтая праца таленавітага даследчыка татарскай спадчыны з'яўляецца каштоўным крокам па захаванні інфармацыі аб мінулым. Выказваю шчырыя надзеі, што гэтая праца стане карыснай для ўсіх, хто цікавіцца культурай татараў-мусульман Беларусі.

*Кіраўнік апарата муфтыяту МРА у РБ Авезаў Максат*

# Прадмова

Шаноўныя чытачы!

Няўмольна бяжыць час, і ў віхуры штодзённых падзей мы забываем пра самае галоўнае, без чаго не было б нас, - пра наша мінулае. Гісторыя, якую стваралі для нас сотні і тысячы пакаленняў, нам, нашчадкам, нельга згубіць, бо той, хто забыўся ранейшае, не мае права на будучыню. Безумоўна, войны, палітыка, міграцыя і асіміляцыя пакінулі свой след на дарозе жыцця, але нават тое, што захавалася ў памяці і сэрцах, дае нам падставу меркаваць, што годнасць, гонар і смеласць – тыя якасці нашага народу, што правялі нас праз вякі, далі магчымасць стаць неад’емнай часткай беларускай нацыі.

На старонках гэтае кнігі я паспрабаваў узгадаць хаця б частку імёнаў нашых продкаў, што сваёй нялёгкай працай стваралі для нас наш сённяшні дзень. Таксама тут прыведзены кароткі летапіс аколіцы Даўбуцішкі у звязку з асноўнымі падзеямі краіны і свету, апісанне мячэці, парафіі. Падрабязна разглядаем біяграфію імамаў і муэдзінаў, што неслі службу ў Даўбуцішках, Дзясятніках, Мураўшчызне, на Ластаі і г.д.

Падчас складання гэтай кнігі мне дапамагала безліч неабыякавых людзей з усяго свету, якім я б хацеў выказаць падзяку і ўзгадаць на старонках кнігі памяці. Гэта Станіслаў Думін, Алена Любая, Рокас Леонас, Айдар Ахтары, Ганна Рафаловіч, Раміс Гараеў, што дапамаглі архіўнымі матэрыяламі і вынікамі ўласных даследванняў. Асобная падзяка муфтэю МРА Беларусі Абу-Бякіру Шабановічу за набыццё метрычных кніг мячэці Мураўшчызна, а таксама Максату Авезаву за доступ да абмерных дакументаў мячэці Даўбуцішкі ў фондах музея народнай архітэктуры ў Строчыцах.

Вусныя звесткі, сямейныя дакументы, фотаздымкі і іншыя матэрыялы падалі Сафія Радзецкая (Варановіч) з Іўя, Сафія Мухарская (Шабановіч) з Палянаў, Сафія Якубоўская (Радкевіч) з Мінска, Лілія Ліс (Радкевіч) з Маладзечна, Лейла Мусіч з Крэва, Зінаіда Гямбіцкая з Багданава, Аляксандр Якубоўскі з Крэва, Эльміра Ахрэм (Базарэвіч) з Маладзечна, Эльміра Мейшутовіч (Якубоўская) з Мінска, Зейнаб Ільясевіч (Радкевіч) з Мінска, Ева Ільясевіч (Радкевіч) з Сінькоў, Галіма Шчуцкая (Ільясевіч) з Іўя, Тамара Шабановіч (Варановіч) з Сінькоў, Тамара Шабановіч (Варановіч) з Багданава, Халіль Асановіч з Дзясятнікаў, Эмілія Радкевіч з Ашмянаў, Мустафа Радкевіч з Іўя, Адам Рафаловіч з Маладзечна, Ева Шэгідэвіч (Рафаловіч) з Наваградка, Зінаіда Радлінская (Ільясевіч) з Ашмянаў, Яцэк Гямбіцкі з Польшчы, Таццяна Рызвановіч з Ашмянаў, Алена Вяршковіч з Сяльца, Зінаіда Якубоўская з Радашковічаў, Аміня Радзецкая (Шчуцкая) з Ашмянаў, Фаціма Шантрукова (Шчуцкая) з Сорак татар і шмат іншых.

# Гісторыя аколіцы

Гісторыя татарскай аколіцы Даўбуцішкі налічвае ўжо не адно стагоддзе і пачынаецца неўзабаве пасля таго, як першыя татары-мусульмане з’явіліся на землях ВКЛ. Татары атрымалі землі ў Даўбуцішках і навакольных паселішчах за вайсковую службу, і з цягам часу гэтае месца стала асяродкам татарскага жыцця ўсяго Ашмянскага павету.

Захавалася няшмат звестак пра гісторыю татараў у Даўбуцішках да XVI ст. Так, у актах продажу зямлі згадваюцца татарскія землеўладальнікі Пятро Мінбулатавіч у 1546, ягоны сын Ахмэт Пятровіч у 1583, Асан і Алей Мартозічы ў 1582, Абрагім Асанавіч Кадышэвіч у 1584, Юсуп і Ніса Адамавічы Наступовічы, Жалуха Абдурахманаўна і Багдан Магаметавіч Індзіневічы ў 1586, Абдула Якубавіч у 1586. А ў 1588 Дэрвіш Чэлебі Кадзі Мурзіч, “духоўнік татарскі Даўбуцішскі”[1].

Такіх актаў куплі-продажу зямлі было шмат, як і колькасць татараў-землеўласнікаў, што насялялі Даўбуцішскае наваколле. Згадваюцца маёнткі і паселішчы Загор’е, Паніззе, Маркава, Несцюкоўшчына, Войкава, Пугачоўшчына, Гарадзілава, Моташы, Сінякоўшчына, Пачопава, Гарані, Сухінава, Паўтароўшчына, Асаны, Місюкоўшчына, Пятроўшчына, Вошчаўшчызна і іншыя, большасць з якіх на сённяшні дзень уже не існуе.

1 кастрычніка 1592 г. князь і харунжы Алікеч Бекгімавіч Улан Асанчуковіч атрымаў маёнтак Даўбуцішкі ў абмен на Засулле[2] ад Яраша Іванавіча Жыжэмскага[3], набыты ім часткамі ў асобных татарскіх уладальнікаў. Розніцу ў коштах маёнткаў Жыжэмскі абяцаў кампенсаваць 234 бочкамі солі.

У 1616 годзе ў судовай справе згадваецца Ахмэт Асановіч, які напаў з жонкай і хаўруснікамі на дом Адама Абрагімовіча ўва Ўланаўшчыне, укараўшы трох коняў, некалькі курыц, сыры, масла і г.д. У тым жа годзе ён з братамі Ібрагімам і Багданам напаў на в. Прусавічы, што належала Яну Абрагімовічу. Сваяк Абрагімовіча, Алей Абрагімовіч, атрымаў частку Даўбуцішак у пасаг ад жонкі Фацімы Ісмаілаўны Адамовіч, продкі якой валодалі тут землямі ўжо доўгі час.

Таксама адным са знаных і заможных у Даўбуцішках быў род Даўгялаў[4]. Яны валодалі землямі ў Паніззі, якія ў 1559 годзе набылі ад мясцовай шляхты. Маёнтак меў назву Паніззе-Даўгялаўскае, адкуль і пайшла назва роду. Даўгялы былі сваякамі Скірмунтам, яшчэ аднаму татарскаму роду ў Паніззі. Найбольш знаным прадстаўніком роду быў Алей Халімавіч Даўгяла, які атрымаў ад бацькі, жаўнера войска ВКЛ, і дзядзькаў Паніззе, ад маці Фацімы Скірмунт – землі ў Даўбуцішках, а ад жонкі Фацімы Ўлан Ластайскай – землі на Ластаі ў другой палове XVII ст.

---

[1] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Том 31. Акты о литовских татарах. Вильно, 1906.
[2] Зараз частка вёскі Засулле ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці.
[3] Актавая кніга Мінскага гарадскога суда за 1592 год, №11766, л. 630.
[4] Валодалі землямі на Ластаі і ў Даўбуцішках яшчэ ў першай палове XIX ст.

У 1640 годзе Шчуцкія набылі зямлю ад сям’і Афіндзевіч – Ібрагіма і Жалісы з Касымовічаў.

У 1644 годзе адзін з маёнткаў Даўбуцішкі набыў Эльяш Ібрагімавіч Крычынскі, які ўжо да гэтага валодаў м. Крычына каля Барысава. Жонкай Эльяша была Рэгіна Самуілаўна Даўгяла, уладальніца земляў у Мураўшчызне і на Ластаі. Пазней, у 1675 годзе, сын Эльяша Аляксандр набыў маёнтак у Паніззі, які меў назву Мяцечы[5]. Нашчадкі Эльяша Крычынскага валодалі Даўбуцішкамі доўгі час, ажно да сярэдзіны XX ст., перадаючы іх дзецям у спадчыну і набываючы новыя надзелы зямлі і фальваркі ў наваколлі.

Так, у першай палове XVIII ст. праўнук Эльяша – Давыд Мустафавіч Крычынскі, ротмістр і Ашмянскі харунжы, набыў Сялец, Кадышаўшчыну і Воўкаўшчыну. Іншыя Крычынскія сталі ўласнікамі ф. Каскевічы, Баўбатова, Чарбашы, Дзеракі і інш. Гэтыя паселішчы належалі Крычынскім да 1939 года.

У 1681 годзе Мустафа Скірмунт набыў у Багдана Аляксандравіча Абрагімовіча ягоную долю зямельных надзелаў у Даўбуцішках, а сваяк Багдана Эльяш Абрагімовіч з жонкай Фацімай Ісмаілаўнай Талькоўскай у 1646 прыдбалі надзелы ў Шчуцкіх. Іхны сын Гамза у 1681 годзе прадаў землі ў Паніззі Алею Даўгялу.



[5] Магчыма форма “мячэць”, т.б. верагодна, што ў Паніззі магла быць мячэць. Або землі належалі мячэці.

У 1688 годзе Адам Яхіч Асановіч з жонкай Фацімай Скірмунт прадалі свае землі Алею Крычынскаму і Алею Даўгялу. Іхны сын Давыд пазней набыў у стрыечных братоў надзелы ў Паніззі, што мелі назву Паўтароўскія.

Праз пэўны час паселішчы Даўбуцішскай парафіі перайшлі ў сталае ўладанне некалькіх заможных родаў – Крычынскіх, Палянскіх, Уланаў, Сулькевічаў, Мухаў, Сабалеўскіх, Байрашэўскіх, Паўтаржыцкіх, Юшынскіх, Тупальскіх, Талькоўскіх, Даўгялаў і інш.

Варта адзначыць, што татары таксама актыўна прадавалі сваю спадчыну каталіцкай шляхце. На момант падзелаў РП большая частка земляў у Гамзічах, Паўтароўшчыне, Панарах, Асанах, Войнічах і іншых паселішчах ужо татарам не належала.

У апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай пры войску былі арганізаваныя палкі пярэдняй варты, у якіх сярод іншых служылі і татары Даўбуцішскай парафіі[6]:

Палкоўнікі: уладальнік ф. Ластая Ян Крычынскі.

Ротмістры: уладальнік ф. Баўбатова Біляль Крычынскі.

Паручнікі: уладальнік ф. Паніззе Якуб Сулькевіч, уладальнік ф. Даўбуцішкі Самуіл Крычынскі, арандатар ф. Ластая Алей Сулькевіч.

Намеснікі: уладальнік ф. Боўдыры Ян Крычынскі, уладальнік ф. Паніззе Эльяш Крычынскі, уладальнік ф. Даўбуцішкі Амурат Крычынскі, уладальнік ф. Ластая Іосіф Талькоўскі, уладальнік ф. Ластая Ян Рудзевіч, уладальнік ф. Ластая Давыд Крычынскі.

Маёры: уладальнік ф. Даўбуцішкі Талькоўскі, уладальнік ф. Ластая Давыд Даўгяла.

Харунжыя: уладальнік ф. Паніззе Сулькевіч, уладальнік ф. Даўбуцішкі Якуб Крычынскі.

Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай, з 1795 да 1921 года Даўбуцішкі, як і амаль усе населеныя пункты парафіі, увайшлі ў склад Расейскай Імперыі і знаходзіліся на тэрыторыі Ашмянскага павету Віленскай губерні. Паляны, Мядзел, Даўгінава, Крывічы, Няверы, Куранец, Гарадок, Ільля і г.д. увайшлі ў склад Вілейскага павету адразу Мінскай, а потым Віленскай губерні. Свянцяны, Гадуцішкі, Камаі, Кабыльнікі (Нарач) і інш. апынуліся ў Завілейскім (потым перайначаны ў Свянцянскі) павеце Віленскай губерні. Больш аддаленыя паселішчы, такія як Відзы, трапілі на тэрыторыю Нова-Аляксандраўскага павету Віленскай, а потым Ковенскай губерні. Пасля стварэння там асобных суполак у сярэдзіне XIV ст. парафія Даўбуцішкі тэрытарыяльна зменшылася да памераў Ашмяншчыны і часткі Вілейшчыны.

Шмат хто з татараў Даўбуцішскай парафіі, сярод якіх былі і былыя жаўнеры пярэдняй варты ВКЛ, прыняў удзел у паўстанні Т. Касцюшкі, у тым ліку ў высокіх рангах. Так, адным з інсургентаў быў харунжы войска ВКЛ Мустафа Самуілавіч Даўгяла, уладальнік земляў у м. Копанае Балота на Ашмяншчыне[7]. Яшчэ адзін – ротмістр Самуіл Мустафавіч Крычынскі, сын

[6] Справы аб шляхецтве
[7] Зараз урочышча на ўсход ад вёскі Загор’е.

ротмістра, а сам падчас Рэчы Паспалітай харунжы 1 полку пярэдняй стражы ВКЛ.

Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай новая адміністрацыя правяла ў 1795 годзе перапіс былых земляў ВКЛ, у тым ліку і Віленскага ваяводства. Паводле перапісу, у склад мусульманскай парафіі Даўбуцішкі ўваходзілі паселішчы, падзеленыя паміж гмінамі Гальшаны, Крэва, Солы, Лоск, Смаргонь і г.д[8]. Найбольшая колькасць татарскіх фальваркаў была ў Крэўскай гміне[9].

Самі Даўбуцішкі на 1795 год уяўлялі сабою 8 фальваркаў. Імі валодалі: Міхал Крычынскі, арандатар каталік Ігнат Спягельскі, Амурат Крычынскі, былы намеснік войска ВКЛ, Фаціма Талькоўская, жонка маёра, арандатар каталік Мацей Стадніцкі, браты Крычынскія – паручнік Самуіл і харунжы Якуб, а таксама Гэлена Давыдаўна Крычынская, удава намесніка войска ВКЛ. Апошні фальварак уяўляў сабою мячэтны фундуш, або вакуф. Тут ужо 45 гадоў жыў імам Даўбуцішскай мячэці Алей Іосіфавіч Шалягоўскі з сям'ёй. Пры ім жылі чэлядзь-татары – Саліх Якубоўскі і Асэя Нячай. Акрамя таго, імам здаваў частку вакуфу ў арэнду сям'і шляхціца-хрысціяніна.

Перапіс таксама паказаў, што татары валодалі фальваркамі Паніззе (Сулькевічы, Крычынскія, Даўгялы), Боўдыры (Ян Крычынскі, былы намеснік войска ВКЛ), Баўбатова (ротмістр Біляль Крычынскі), Лашаны (Самуіл Шагуневіч), Сялец (Давыд Крычынскі), Саковічы (Сулькевічы). Акрамя таго, у вёсцы Ракаўцы жыў гарбар Іосіф Мустафавіч Глянбоцкі (40 гадоў) з сям'ёй. У ф. Гамзічы жылі 2 татарскія сям'і – Мустафы Казіміравіча Байрашэўскага і Самуіла Іванавіча Шчэрбы.

У м. Крэва татары жылі на правах арандатараў і займаліся гарбарствам. Гэта сем'і Яна Асановіча, Мустафы Мураўскага, Давыда Мейшутовіча, Іосіфа Базарэвіча і Якуба Базарэвіча.

Больш аддаленыя татарскія ўладанні знаходзіліся на Ластаі. У перапісе згадваецца ажно 14 фальваркаў з назвай Ластая, якімі валодалі Рудзевічы, Талькоўскія, Сулькевічы, Даўгялы, Асановічы і Крычынскія, каталікі Мацкевічы. Акрамя таго, тут таксама быў вакуф, на якім жыў муэдзін.

Маёнтак Бяргалішкі трымаў ротмістр Ян Ахматовіч, а затым ротмістр Ян Крычынскі. Фальварак Ровы належаў Давыду Сабалеўскаму, ф. Багданава трымаў Самуіл Шагуневіч. У Бянюнах[10] жыў таварыш войска ВКЛ Захар Данілавіч Сабалеўскі з сям'ёй, здаваў зямлю ў арэнду Яну Букатаму.

У Гальшанах жылі сем'і Гямбіцкіх і Якубоўскіх, у Смаргоні 3 татарскія сям'і – Алея Хусэйнавіча Гямбіцкага, Адама Багданавіча Багаты і Багдана Гямбіцкага. Займаліся гарбарствам. У м. Жупраны жыла толькі адна татарская сям'я гарбара Алея Мустафавіча Якубоўскага. У м. Валожын – Рафал Раманавіч Шчуцкі з сям'ёй.

У м. Вішнева[11] жылі 3 сям'і татараў-гарбароў Гямбіцкіх, Рызвановічаў і Ждановічаў. У м. Ліпнішкі[12] жылі 4 татарскія сям'і – братоў Багдана, Ібрагіма і

[8] Электронныя копіі на www.familysearch.org
[9] LVIA F 515 A 15 B 90
[10] LVIA F515 A15 B87
[11] LVIA F515 A15 B105

Рамана Рафалавічаў Александровічаў, а таксама Аляксандра, сына Багдана, Александровіча. Да гміны м. Лоск належалала паселішча Лашаны, дзе жыла адна татарская сям'я – Давыд Мустафавіч Яблонскі з жонкай Фацімай.

Што да аколіцы Мураўшчызна, якая ўваходзіла ў склад гміны Іўе Ашмянскага павету, то тут былі 23 татарскія гаспадаркі, у якіх жыло 27 татарскіх сем'яў агульнай колькасцю 146 чалавек (80 муж., 66 жан.)[13]. Прозвішчы – Александровічы, Рызвановічы, Лебедзі, Сафарэвічы, Мухі, Шабановічы, Радкевічы, Рафаловічы, Гямбіцкія, Ільясевічы, Мураўскія, Якубоўскія і Рачыповічы[14]. Найбольш знанай асобай татарскай супольнасці Мураўшчызна быў былы харунжы войска ВКЛ Якуб Сапаравіч Сафарэвіч, які паставіў свой подпіс пад перапісам.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай працягвалася пераразмеркаванне зямлі паміж татарскімі землеўласнікамі. З'явіліся новыя ўладальнікі, такія як Паўтаржыцкія і Лебедзі.

У 1802 годзе для вернікаў парафіі быў уведзены падатак на ўтрыманне мячэці, які складаў 2 злотыя штогод ад кожнай сахі. Агульная колькасць сох парафіі была 176[15].

У 1805 годзе Якуб Радкевіч атрымаў ад Крычынскіх невялікі пляц зямлі ў 9 дзесяцін у Даўбуцішках, за які ён і ягоныя нашчадкі мусілі даглядаць мізар і чытаць малітвы за душы пахаваных Крычынскіх. Варта адзначыць, што дынастыі Радкевічаў захаваліся тут да нашых дзён.

У 1811 годзе быў праведзены чарговы перапіс насельніцтва ў РІ, паводле вынікаў якога назіраецца пэўная дынаміка татарскіх паселішчаў і фальваркаў парафіі[16]. На жаль, там пазначаліся толькі мужчыны, а жанчыны толькі ў тым выпадку, калі яны валодалі фальваркамі. Шмат хто з татараў на той момант ужо служыў у войску РІ.

Так, фальварак Каскевічы быў набыты харунжым Мустафой Іосіфавічам Крычынскім. Фальварак Чаркасы перайшоў ува ўласнасць Якуба Аляксандравіча Мухі, былога харунжага войска ВКЛ. Адзін з фальваркаў Даўбуцішкі атрымаў новы імам – Якуб Іосіфавіч Лебедзь, які пераехаў сюды з Багонікаў. Атрымаў ён яго ад ротмістра і кавалера татарскага уланскага полку Давыда Эльяшавіча Крычынскага. Фальварак Гамзічы татарам ужо не належаў. Ім валодалі хрысціяне Захарэўскія і Юрэвічы.

У м. Крэва Давыд Іосіфавіч Мейшутовіч пазначаны як жаўнер ў татарскім полку РІ з 1796 года. Ягоны брат Адам выехаў у Смаргонь у 1804. Сымон і Стэфан, дзеці Якуба Аляксандравіча Базарэвіча, выехалі з Крэва ў 1803. З'явіліся і новыя сем'і: Якуб Аляксандравіч Радкевіч з сынамі Давыдам і Алеем пераехаў у Крэва з Мураўшчызны ў 1807, Давыд Самуілавіч Гямбіцкі – з Даўбуцішак у 1809, Самуіл Іосіфавіч Шчуцкі – з Лебедзева Вілейскага павету ў

[12] LVIA F515 A15 B92
[13] LVIA F515 A15 B89
[14] Прозвішча трапляецца ў перапісе Наваградка за той жа год.
[15] Rocznik Tatarski. T. 3, 1938, st. 201
[16] LVIA F515 A15 B213

1798, Іосіф Міхайлавіч Мураўскі – з Мураўшчызны ў 1803, а Ібрагім Іосіфавіч Мейшутовіч – з Мінска ў 1810 годзе.

Татары Даўбуцішкай парафіі прынялі ўдзел і ў вайне Напалеона з Расейскай імперыяй, прычым з абодвух бакоў. Адны лічылі яго ворагам, а іншыя – гарантам аднаўлення Рэчы Паспалітай. У войска Напалеона трапілі Алей і Іосіф Гямбіцкія з Ластаі, Давыд Багданавіч Абрамовіч[17] і інш.

Што да татараў, якія змагаліся супраць Напалеона, то тут варта згадаць Яна Давыдавіча Заблоцкага (1781 г.н.) з маёнтка Забалоцце пад Карэлічамі, сына паручніка. Падчас бою пад Кульмам заслужыў крыж Св. Георга з рук імператара Аляксандра. Пахаваны на мізары ў Даўбуцішках у 1830-ыя гады. Цікава, што ягоная жонка Мяр'ема Іосіфаўна з Крычынскіх, якая была родам з Даўбуцішак, пахаваная на мізары ў в. Забалоцце.

У Даўбуцішскай парафіі існавалі муцівілі, або старасты (старшыні), якія ад імя вернікаў звярталіся ўва ўладныя структуры і ТМДУ[18]. Выбіраліся яны з найбольш знаных і выбітных асобаў – генералаў, палкоўнікаў і г.д.

Пры мячэці таксама існаваў вакуф, або зямельны надзел, з якога жыў імам. Зямлю ахвяравалі заможныя вернікі, такія, як, напрыклад, Эльяш і Якуб сыны Даніэля Юшынскага.

Падчас панавання РІ ўсе мусульманскія парафіі былога ВКЛ, у тым ліку і Даўбуцішкі, былі падпарадкаваныя муфтыяту ў Сімферопалі (ТМДУ). З гэтага часу імамам даводзілася дасылаць у Крым копіі метрычных запісаў, а вернікам звяртацца туды, каб зацвердзіць імамаў і атрымаць дазвол на будоўлю і рамонт мячэцяў.

У 1841 годзе ў Даўбуцішскай мячэці з прапановы муцівіля падпалкоўніка Эльяша Крычынскага адбылося ўрачыстае набажэнства[19] ў гонар імператарара Мікалая І. Адзін са знаных вернікаў парафіі Бякір Ахматовіч, што скончыў курсы філасофска-юрыдычных навук у Імператарскім універсітэце Св. Уладзіміра, перад яго пачаткам выступіў са словамі падзякі імператару. Затым падчас намазу мусульмане маліліся за ягонае здароўе. Пасля малітвы муцівіль запрасіў прысутных на абед у свой маёнтак, дзе таксама аддавалі хвалу Мікалаю І. Увечары быў праведзены баль. Выступоўцы падкрэслівалі, што Расейская імперыя ў асобе ейнага кіраўніка ўсяляк дбае і спрыяе татарам былога ВКЛ.

У XIX ст. аддаленыя паселішчы Даўбуцішскай парафіі сталі будаваць уласныя мячэці, малітоўныя дамы і ствараць асобныя парафіі з мізарамі. Так, ужо ў 1816 годзе, паводле перапісу[20], у Вілейскім павеце існавалі два імамы. Гэта былі Азюль Сюляйманавіч Бяганскі ў мястэчку Крывічы і Ібрагім Мустафавіч Якубоўскі ў м. Гарадок, што пад г. Маладзечна. Бяганскі пэўны час дадаткова выконваў абавязкі імама ў Відзах і Даўбуцішках.

[17] Нарадзіўся 29.07.1794, метрыка Даўбуцішкі.
[18] Таўрыцкая магаметанская духоўная ўправа.
[19] Артыкул пра набажэнства быў надрукаваны ў часопісе «Виленский вестник» – «Kurier Wileński». 1841. № 102-103 (30 снежня). С. 811-812
[20] LVIA F515 A15 B444

Паводле перапісу мусульманскіх суполак Віленшчыны, праведзенага ў 1841 годзе[21], у губерні акрамя 6 парафій з мячэцямі (у Даўбуцішках, Вільні, Немежы, Рэйжах, Сорак татар, Некрашунцах) існавалі 2 аўтаномныя без уласных мячэцяў у складзе Даўбуцішскай – у Мядзелі і ў засценку Рэпішча[22] Вілейскага павету. Колькасць вернікаў Даўбуцішскай мячэці была найбольшай сярод іншых у губерні і складала 274 мужчыны і 236 жанчын.

Што да ўласных мячэцяў, то першымі пабудавалі сваю мусульмане м. Відзы Ковенскай губерні ў сярэдзіне XIX ст. Затым Мядзел, дзе абавязкі імама першы час выконваў Даўбуцішскі імам[23]. Нарэшце, у 1882 годзе вернікі Мураўшчызны пабудавалі мячэць, хоць імамы існавалі тут і раней[24]. Пэўны час пасля гэтага мусульмане Мураўшчызны належалі да Даўбуцішак, пакуль на пачатку XX ст не атрымалі ўласную мячэтную пячатку.

Аўтаномію мела і мусульманская суполка на Ластаі, дзе жылі больш заможныя татары. Выбіраўся ўласны муэдзін, муцівіль, і знаходзіўся малітоўны дом, а таксама некалькі мізараў.

Неафіцыйна годжыя і муэдзіны існавалі таксама ў Гальшанах, Дзясятніках, Палянах, Крэве, Ашмянах і іншых буйных паселішчах парафіі. Яны вучылі дзяцей па хатах і выконвалі рэлігійныя паслугі на месцах або мізарах.

Пасля паўстання 1863 – 1964 гадоў для выбараў імама даводзілася падаваць дакументы, якія сведчылі, што кандадаты лаяльныя да ўлады, не былі пад судом і следствам і г.д.

У другой палове XIX ст. у Даўбуцішкай парафіі нарадзілася шмат знаных людзей, дзеячоў навукі і культуры. Гэта генерал, сябра Варшаўскага камітэту дапамогі бедным мусульманам Хасень Эльяшавіч Крычынскі (1847 - 1924) з Абазішча, ягоныя дзеці, суддзя, уладальнік маёнтка Гарэцкаўшчына Ольгерд і суддзя Леон, якія ў міжваеннай Польшчы займаліся культурна-асветніцкай працай. Яшчэ адзін прадстаўнік роду – Мустафа Самуілавіч Крычынскі (1874 - 1923) з Каскевічаў – стаў знаным архітэктарам і праектаваў у тым ліку і мячэць у Пецярбургу. Генерал Самуіл Булатавіч[25] Крычынскі, палкоўнік Магамет Мустафавіч Крычынскі, сенатар Алей Магаметавіч Ахматовіч, прафесар Асман Аляксандравіч Ахматовіч і інш. паходзілі з Даўбуцішскай парафіі.

Таксама пасля паўстання татары сталі больш актыўна набываць малыя і сярэднія маёнткі ў Ашмянскім павеце, канфіскаваныя ў інсургентаў, у асноўным “польскага паходжання”. Ім спрыялі заканадаўчыя акты, які вызвалялі татараў ад збору кантрыбуцыі. Так, у 1868 годзе ўладальнік Бяргалішак і Кутоў маёр Магамет Ахматовіч набыў канфіскаваны маёнтак Ценюкоўшчына (каля 1060 дзесяцінаў) на рацэ Якунька паміж Юрацішкамі і Трабамі, а таксама Гарадзілава каля Маладзечна. У 1871 капітан Магамет Мустафавіч Крычынскі стаў уладальнікам м. Папялевічы (каля 720 дзесяцінаў)

[21] LVIA F382 A1 B3
[22] Паселішча нідзе больш не траплялася ў дакументах.
[23] У XX ст. парафіі Паазер’я падзяліліся яшчэ на некалькі – з цэнтрамі ў Докшыцах і Глыбокім.
[24] Мустафа Ібрагімавіч Багдановіч (1831 - 1917) быў імамам Мураўшчызны ў 1880-ых гадах.
[25] У іншых крыніцах Білялевіч.

каля Крэва, які да канца XVIII ст. належаў татарам Багдановічам. Хасень Эльяшавіч Крычынскі набыў Паўлінова, Абазішча і Ровы[26].

Калегіяльны дарадца Давыд Іванавіч Базарэўскі ў 1869 набыў м. Баніфацава (каля 2300 дзесяцінаў) на рацэ Ашмянка, да якога ён і нашчадкі пазней далучылі навакольныя маёнткі Варакумшчына, Коўпры, Заазерцы, Лісава, Васюкі, Мохаўка, Пераходы, Пяскі, Ратаголь, Упаль, Сінгяны і г.д.

На пачатку XX ст Даўбуцішская парафія ахоплівала наступныя маёнткі і паселішчы[27]: Баўбатова Крычынскіх, Бяргалішкі Ахматовічаў, Дзяракі Лебедзяў, Даўбуцішкі (у тым ліку млын) Талькоўскіх, Касымава Талькоўскіх, Каскевічы (у тым ліку 2 млыны) Крычынскіх, Копанае Балота Даўгялаў, Капланы Крычынскіх, Крыўск Паўтаржыцкіх, Крыжаўка Крычынскіх, Курпава Талькоўскіх, Ласавічы Талькоўскіх і Лебедзяў, Ластая Талькоўскіх, Крычынскіх, Сулькевічаў і вакуф Александровічаў, Леанполле Чымбаевічаў, Папялевічы Крычынскіх, Рымцелі Крычынскіх, Сялец Крычынскіх, Ценюкоўшчына Ахматовічаў, Цярэшкі Лебедзяў, Чарняўшчына Чымбаевічаў, Чырвоны Двор Талькоўскіх, Юзафполь Талькоўскіх і г.д.

У канцы XIX – пачатку XX ст. актыўна ішла эміграцыя насельніцтва з РІ ў ЗША. Татары з Даўбуцішскай парафіі таксама прынялі ў ёй ўдзел, асабліва з Мураўшчызны, якія стварылі першую арганізаваную мусульманскую парафію ў Нью-Ёрку. З Сяльца выехалі 2 браты Алей і Тамерлан Іосіфавічы Мураўскія, адзін з якіх, Тамерлан, потым займаў там пасаду старшыні.

Падчас Першай сусветнай вайны доўгі час праз Даўбуцішскае наваколле праходзіла лінія фронту, спусташаючы маёнткі, сядзібы, знішчаючы мізары. Мястэчка Крэва са сваім знакамітым замкам апынулася на нямецкай тэрыторыі і моцна пацяпрела падчас атакі артылерыі. Да ластайскага мізара немцамі была праведзеная вузкакалейная чыгуначная лінія, адгалінаванне чыгункі Багданава – Солы праз Баруны, а на тэрыторыі мізара пабудаваныя два бетонныя абарончыя збудаванні. Пахаванні пры гэтым былі пашкоджаныя. Што да жыхароў, то іх перад набліжэннем фронту прымусова вывозілі ў Мінск, Смаленск, Казань, Аранбург, Крым і г.д.

У міжваенны час, з 1921 па 1939 год, Даўбуцішкі ўваходзілі ў склад Беніцкай гміны Маладзечанскага павету Віленскага ваяводства другой Рэчы Паспалітай. Іншыя паселішчы парафіі, такія як Крэва, Ластая, Куты, Янушы, Бергалішкі, Гальшаны – у склад Ашмянскага павету таго ж ваяводства, а Дзясятнікі, Зафінова, Багданаў і Вішнева – Валожынскага павету Наваградскага ваяводства.

Першыя пасляваенныя гады даводзілася адбудоўваць разбураныя дамы і гаспадаркі. Пачалося перасяленне татараў у больш буйныя вёскі і мястэчкі – Крэва, Ашмяны, Смаргонь, Гальшаны. У Даўбуцішках працягвала дзейнічаць школа для дзяцей, у парафіяльным доме праводзіліся мерапрыемствы. Польскі ўрад па магчымасці дапамагаў фінансава рэлігійным парафіям, у тым ліку і

[26] Т. Байрашаускайте. Татарское землевладение в Виленской губернии во второй половине XIX – начале XX века. Материалы конференции «История и культура тюрков в Литве», 29-31 мая 2013. Вильнюс, 2014, с.50

[27] Гашкевич, И.И. Виленская губерния. Полный список населённых мест со статистическими данными о каждом поселении. Вильно, 1905.

мусульманскім, бо імамы выконвалі частку арганізацыйнай работы – вялі метрычныя кнігі, выдавалі даведкі і г.д. Фінансаванне ішло праз Віленскую мячэць на Лукішках, якая ў першыя пасляваенныя гады стала дэ-факта цэнтрам рэлігійнага жыцця татараў Польшчы[28].

Татары працягвалі валодаць маёнткамі Папялевічы (Крычынскія), Варакумшчына (генерал Рамановіч), Баніфацава (Базарэўскія), Ластая (Талькоўскія, Крычынскія, Сулькевічы), Лайлубка (Крычынскія), Дзяракі (Лебедзі), Куты, Касымава і інш.

Былы муфтыят у Сімферопалі спыніў сваё існаванне, да таго ж, усе дзейныя мусульманскія цэнтры апынуліся на тэрыторыі СССР, таму з'явілася неабходнасць уласнага муфтыяту. Ён быў заснаваны ў Вільні, а муфтэем стаў доктар філасофіі Якуб Сюляйманавіч Шынкевіч[29]. У склад муфтыяту ўвайшлі ўсе мусульманскія парафіі міжваеннай Польшчы, у тым ліку і Даўбуцішкі.



Найвышэйшая рада МРА міжваеннага часу. Лют Мухля другі злева стаіць.

Пра статус даўбуцішскай мячэці ў міжваенны час сведчыць той факт, што ейныя імамы прымалі актыўны ўдзел ува ўсіх мерапрыемствах муфтыяту ў Вільні, уваходзілі ў склад Найвышэйшай рады МРА[30]. Удзельнічалі імамы таксама і ў афіцыйных мерапрыемствах улады, напрыклад, падчас пахавання ў Вільні сэрца Юзафа Пілсудскага ў 1935 годзе разам з муфтэем былі запрошаныя імам Віленскай Саборнай мячэці Ібрагім Смайкевіч і даўбуцішскі імам Лют Мухля. Высокі статус мячэці таксама быў абумоўлены тым, што

[28] LVIA-F378-74-17
[29] Паходзіў з Ляхавічаў, а ягоная жонка з Ластаі.
[30] МРА – Мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне.

сярод вернікаў парафіі было шмат знаных і заможных людзей, якія валодалі тут маёнткамі, а жылі і працавалі ў Вільні.

У міжваенны час назіраўся росквіт парафіі. Дзякуючы фінансаваму стану вернікаў, мячэць рамантавалася, рэлігійнае жыццё і навучанне дзяцей не спынялася. Пры парафіі знаходзіліся вакуфныя землі, якія на 1937 год складалі 34 дзесяціны ў Даўбуцішках і 8 дзесяцінаў на Ластаі. Імі карысталіся імамы і муэдзіны.

З 1939 па 1940 год Даўбуцішкі знаходзіліся ў Маладзечанскім павеце Вілейскай вобласці БССР, а з 1940 па 1944 – у Смаргонскім раёне Вілейскай вобласці. Пачалася нацыяналізацыя і перадзел маёмасці былых уладальнікаў. Так, былі разрабаваныя сядзіба Шабановічаў у Даўбуцішках, Ластая Сулькевічаў, дзе пазней зрабілі школу, Гарэцкаўшчына Крычынскіх, якую арандавалі браты Гузоўскія, Бяргалішкі Ахматовічаў, Папялевічы Крычынскіх і г.д.

Падчас вайны рэлігійные жыццё працягвалася, але жыхары моцна пакутавалі як ад акупантаў, так і ад мясцовых бандытаў. Так, у Дзясятніках немцы забілі Сяліма Гямбіцкага і Якуба Александровіча, а Якуб Якубоўскі бясследна знік. У Вішневе закатавалі Сафію Гямбіцкую, якая ратавага габрэйскіх дзяцей з гета, і Аляксандра Ждановіча (быў сакратар сельсавету з 1939 па 1941). У Даўбуцішках невядомыя забілі Алея Шабановіча. Але варта адзначыць, што акупацыйная ўлада часткова вярнула землі і сядзібы ўладальнікам.

З 1944 па 1960 год Даўбуцішкі апынуліся ў складзе Смаргонскага раёна Маладзечанскай вобласці, частка парафіі – у Валожынскім раёне Маладзечанскай вобласці. Мусульманская парафія ў пасляваенны час была афіцыйна зарэгістраваная і ўваходзіла ў муфтыят Уфы, паколькі былы муфтыят на чале з Я. Шынкевічам пасля выезду апошняга ў Егіпет спыніў сваё існаванне. Парафія на гэты час налічвала каля 150 вернікаў. Пасля таго, як з Даўбуцішак выехаў імам А.С. Рафаловіч, рэгістрацыю парафіі скасавалі. Пачаўся паступовы заняпад былой аколіцы і парафіі, разбурэнне мячэці, але дні памяці на мізарах праходзілі штогод.

У гэты перыяд было знішчана шмат мізараў, у тым ліку старажытныя ў Паніззі, Загор'і, Паўтароўшчыне, Войташах, Гамзічах, Дзяраках і г.д. Падчас калектывізацыі ў татараў адабралі землі, пакінуўшы толькі невялікія агароды, а некаторых гвалтоўна перасялілі з хутароў.

З 1960 года да сённяшняга дня Даўбуцішкі знаходзяцца ў Сінькоўскай гміне (сельсавеце) Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. У гэты перыяд разабралі парафіяльны дом, будынкі школы, а большасць жыхароў раз'ехалася ў буйныя гарады. Млын на рацэ Драя таксама разбурыўся. Сінькі сталі разрастацца за кошт сцягвання сюды навакольных хутароў і фальваркаў і паглынулі сабою былыя паселішчы Капланы і Каскевічы.

У 1980-ыя гады на мячэць, якая мела нязвыклую для беларускіх татараў форму, нарэшце звярнуў ўвагу музей народнага дойлідства ў Строчыцах. Стан

будынка ўжо быў даволі дрэнны. Праводзіліся абмеры і фатаграфаванне, затым будынак цалкам разабралі і перавезлі ў Мінск.

На 1991 год у Даўбуцішках ад былой велічы застаўся толькі мізар і некалькі татарскіх гаспадарак, дзе пастаянна жыў толькі Алей Радкевіч. Таму падчас нацыянальнага адраджэння татараў у сярэдзіне 1990-ых гадоў парафію ў Даўбуцішках арганізаваць не змаглі, бо бракавала вернікаў. Бліжэйшыя буйныя татарскія паселішчы былі ў Маладзечне і Ашмянах, таму мусульманскія парафіі арганізавалі там. Даўбуцішкі з мізарам ўвайшлі ў склад парафіі Маладзечна, а ўрочышча Ластая – ў склад парафіі Ашмяны, якія далучыліся да Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў РБ.

Штогод на мізарах ладзяцца дні памяці[31], якія наведваюць муфтэй МРА[32], імамы Ашмянаў, Іўя і Маладзечна.

З 2018 года населены пункт Даўбуцішкі не існуе, а дамы далучаныя да вёскі Ласавічы.

### *Ластая*

Адметны статус у Даўбуцішскай парафіі мела суполка татараў Ластаі. Па-першае, Ластая знаходзілася на даволі значнай адлегласці ад Даўбуцішак (каля 18 км), па-другое, тут жыло шмат знаных і заможных татараў, таму падпарафія арганізавалася тут ужо на пачатку XIX ст. Але гісторыя Ластаі сягае ажно ў XVI стагоддзе.

Землямі на Ластаі татараў надзялялі за вайсковую службу. Найбольш знанымі землеўласнікамі тут былі Ўланы, якія пазней атрымалі “прозвішча” Ластайскі. Былі яны нашчадкамі старажытных князёў Асанчуковічаў, што паходзілі з Паволжа.

У 1625 – 1631 гадах ашмянскім земскім пісарам Янам Кярдэем быў праведзены перапіс татарскіх земляў Ашмяншчыны, які паказаў, што татарам належалі: Ластая, Урляняты, Бярэзіна, Сялец, Мыса, Гамзічы, Казякі, Мысаковічы, Тулубаі, Багданава, Кумяляны, Каяцяняты, Палачаны, Паніззе, Святляны. На Ластаі татарскія землі знаходзіліся з абодвух бакоў і цягам усёй даўжыні ракі Ластаянка[33].

З часам асобныя надзелы зямлі на Ластаі атрымалі ўласныя назвы ад імёнаў уладальнікаў – Ластая-Ахматаўшчына, -Амбражэўшчына, -Няптуны, -Сарапанаўшчына (пазней Ардашы), Тупчы, Зелькаўшчына, Куты і г.д., частка з якіх стала асобнымі вёскамі і існуе да нашага часу.

Паводле перапісу Кярдэя, у 1631 годзе ластайскія татары на ваенныя патрэбы давалі 6 коняў, што адносна няшмат. Падчас Рэчы Паспалітай адбывалася пастаянная дынаміка ластайскіх земляў – яны пераходзілі ўва ўласнасць хрысціянскай шляхты і набываліся назад.

У 1802 годзе татары з Ластаі сталі плаціць пасошны падатак на парафію. Крычынскія, напрыклад, плацілі за Ластаю з 4 сох, а Мустафа Даўгяла,

[31] Ластая – трэцяя субота ліпеня, Даўбуцішкі – другая субота жніўня.
[32] Адзін з такіх дзён памяці ў 1997 годзе ён занатаваў на відэа.
[33] Kryczynski, Leon. Dobra Łostajskie: (1600 - 1789), Wilno, 1930.

Рудзевічы, Талькоўскія і Сулькевічы агулам з 31 сахі. Сабалеўскія, якія валодалі землямі ў Бянюнах і Ровах, плацілі з 12 сох. Ахматовічы з Каяцянятаў, Бяргалішак і Кутоў – 12. Іншыя Крычынскія за Боўдыры – 2.

Магчыма ў гэты ж час быў заснаваны вакуф у 8 дзесяцінаў з зямлі, перададзенай Сулькевічамі. Вакуф знаходзіўся на захад ад мізарнага гаю і абмяжоўваўся Ластаянкай і маёнткам Сулькевічаў. Ім карысталіся муэдзіны Ластаі ажно да калектывізацыі ў 1950-ыя гады.

Слоўнік геаграфічны за 1866 год дае звесткі, што ў адным з паселішчаў на Ластаі жыло 28 хрысціянаў, з якіх 18 праваслаўных і 10 каталікоў, існавала капліца і працаваў млын. У другім паселішчы з той жа назвай Ластая – 5 гаспадарак, дзе жыло праваслаўных 33, каталікоў 17, мусульман 22 і габрэяў 18. У Кутах – 2 гаспадаркі з 18 мусульманамі і 11 габрэямі.

У міжваенны час ластайскія татары валодалі надзеламі плошчай каля 600 дзесяцінаў. Дадаткова, землі былі ў Бяргалішках, Абазішчы і Ровах. Найбагацейшымі былі Крычынскія, Ахматовічы, Талькоўскія і Сулькевічы, потым Яблонскія, Гямбіцкія і Паўтаржыцкія. Астатнія татары мелі агароды і займаліся гарбарствам – Абрамовічы, Шчуцкія, Александровічы, Якубоўскія і інш.

Памерлых ластайскія татары хавалі на мясцовым мізары, які называлі “мізяр”. Ён знаходзіцца ў гаі справа ад шашы Ардашы – Куты на пагорку. Першы мізар быў запоўнены яшчэ падчас Рэчы Паспалітай, і на тэрыторыі можна заўважыць вяршыні надмагільных камянёў без надпісаў. Пазней у тым жа гаі на паўночны ўсход ад старога быў закладзены новы мізар, дзейны да нашага часу. Аточаны глыбокім ровам, а на ўваходзе была брама на бетонных слупах.

Падчас Першай усясветнай вайны каля Ластаі праходзіў фронт, немцы правялі вузкакалейную чыгунку праз Ластаю. На тэрыторыі мізара з’явіліся 2 бетонныя абарончыя збудаванні.

У пасляваенны час паселішча Ластая існавала ў выглядзе трох асобных гаспадарак[34] і будынка школы, а пасля калектывізацыі сядзібу муэдзіна перавезлі ў Крэва. На сённяшні дзень назву Ластая мае толькі ўрочышча з мізарам.

[34] Адна муэдзіна Мусіча і 2 каталіцкія.

## Мячэць і рэлігійнае жыццё

Зараз ужо немагчыма сказаць, калі і дзе дакладна з’явілася першая мячэць у Даўбуцішках. Адны сцвярджаюць, што мусульманская парафія была заснаваная тут ў 1588 годзе[35], іншыя – у 1598[36]. Мякуецца, што ў гэты ж час была пабудаваная мячэць. Таксама некаторыя крыніцы даюць звесткі, што першапачаткова яна стаяла ў в. Сялец, а затым перанесеная ў Даўбуцішкі.

Будынак мячэці шмат разоў рамантаваўся. Так, у 1829 годзе імам Давыд Александровіч і званыя вернікі парафіі сведчылі, што рамонты былі ў 1727 годзе[37] за кошт ротмістра Абрагама Крычынскага і ў 1819, калі дах пафарбавалі ў чырвоны колер за сродкі палкоўніка Амурата Крычынскага і ягонай жонкі Сюзанны[38].

У 1890 годзе падчас зацвярджэння М. Смайкевіча імамам павятовыя ўлады пісалі, што “*мячэць у Даўбуцішках мае 70 гадоў з часу пабудовы (рамонту), але з чыйго дазволу - невядома*”. Паводле мусульманскага календара 1937 года, мячэць у Даўбуцішках была адбудаваная ў 1757 годзе.

Адметнасцю Даўбуцішак і сведчаннем высокага статусу гэтага месца ў рэлігійным жыцці татараў ВКЛ можа служыць наяўнасць тут кадзі (шарыяцкага суддзі). Так, дакумент, датаваны 2 сакавіка 1594 г., сведчыць: у суд прыйшоў “татарын гаспадарскі павету віленскага *дэрвіш чэлебі хадчы* Мурзіч, кадзі ўсіх татар ВКЛ”, які заявіў, што пасля смерці ён вызваляе свайго нявольніка Івашку Пятровіча, а за гэта адпушчаны пасля смерці свайго былога гаспадара будзе павінен маліцца за яго душу. Атрымаў ён гэтага нявольніка ад папярэдняга кадзі Алея Абрагімовіча.

Наконт Мурзіча цікавыя звесткі знайшоў знаны навукоўца, геральдыст і публіцыст Станіслаў Думін[39]. Аўтар піша, што ў Літоўскай метрыцы, кніга 67, на кірыліцы ёсць прывілей Мурзічу на пасаду кадзі ўсіх татараў. Ён быў выдадзены ў Гародні 18 ліпеня 1586 года каралём Стэфанам Батурам пасля таго, як яго прасілі пра гэта “князі, мурзы і ўсе татары ВКЛ”.

Тэкст прывілею[40]:

*Привилей татарину дервишы челебею на кадыйство, то ест старшеньство в духовенстве над всими татарами у Великом князстве Литовском.*

*Стефан, Божью милостью король польский*

*Ознаймуем сим нашим листом. Били нам чолом хоружые, маршалки князи, муръзы, уланы и вси татарове Великого князства Литовского, и поведили перед нами, иж духовъника их старшого Алея молы Абрагимовича в жывоте не стало, и просили нас господара, абыхмо кадыйство дали деръвиши челебию*

[35] А. Лакотка. Бераг вандраванняў, або Адкуль у Беларусі мячэці.
[36] Л. Крычынскі. Dobra Łostajskie, Вільня 1930.
[37] Новы будынак мячэці.
[38] LVIA F382-1-3
[39] S. Dumin, Urząd kadiego u tatarów w Wielkim Księnstwie Litewskim w XVI w. s świetle przywileju króla Stefana Batorego 1586 r. // Tożsamość a religia Tatarów WKL. Pod red. A. Konopackiego, Białystok, 2017.
[40] РГАДА, Ф. 389, О. 1, Д. 281, с. 246-246 об.

*Хадъчыю Мурьзеевичу, яко мы з ласки нашое господарское и на чолом битье их то въчинили, тое кадыйство старъшое духовеньства закому их татаръского оному деръвичы челебею Хадъчыю Мурьзеевичу до жывота его дали, и сим листом нашым даем, мает он кадыемстаръшым духовъником их, всих татар Великого князства Литовъского во всем ся справовати, и в речах духовъных татаръских судити справовати, и водле духовенъства отправу чынити, по якому, яко перъшыйкадый духовъник их тое кадыйство держал и им справовал, и на то дали есьмо дыръвишы челебею Мурьзеевичу сесь наш лист с подъписом руки нашое господаръское и з нашою печатью. Писан у Городъне лета Божого нароженья АФПЅ 1586 месяца июля осмнадцатого дня.*

Кадзі меў права кантраляваць усіх імамаў на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Таксама варта адзначыць, што мінбар Даўбуцішскай мячэці складаўся ажно з 9 прыступак. Такой колькасці не мела ніводная іншая мячэць, пабудаваная на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы.

Унутранае ўбранства мячэці добра апісалі навукоўцы падчас даследвання, праведзенага ў 1928 годзе, пасля якога мячэць дадалі ў спіс помнікаў драўлянага дойлідства Польшчы.



План мячэці

Мячэць уяўляла сабою драўляны зрубны будынак прамавугольнай формы (7х11 м.) з адкрытай галерэяй з паўночнага і часткова заходняга бакоў на разных слупах. На галерэі ў паўночна-заходнім куце размешчаны двухпавярховы мінарэт вышынёю каля 6,5 м., на які вяла лесвіца. Колькасць вокнаў на будынку – 9, дзвярэй – 2. 4 акны размешчаныя на мінарэце. Сцены складзеныя з брусоў прамавугольнага профілю. Пэўны час на сценах унутры мячэці былі шпалеры, а пазней іх ашалявалі дошкамі.

Асноўны будынак падзелены на мужчынскую і жаночую паловы драўлянай сценкай з вакном з 33 стрыжняў. У мужчынскім пакоі на вышыні 1 м. над падлогай быў балкон. Пад балконам стаялі 2 лаўкі. Будынак стаяў на падмурку, складзеным з камянёў. Два ганкі адлітыя з бетону. Купал быў зроблены з гонты і першапачаткова пафарбаваны ў чырвоны колер. Над галоўным уваходам размешчаны надпіс-шахада.

Вокны большыя 1,4х1,9 м., з дзьвюма рамамі. Вокны меншыя 0,7х1,3 м. Слупы 20х20 см., вышынёй 2,1 м. На кожным слупе спіральная разьба дзьвюма ніткамі.

Пасля таго, як у міжваенны час мячэць дадалі ў спіс помнікаў, яна атрымала ахоўны статус, таму рамонт і іншыя працы з будынкам абавязкова павінны былі выконвацца толькі з дазволу ўправы ваяводства.



Мячэць. Выгляд з паўднёвага боку.

Падчас вайны мячэць не пацярпела, як некаторыя іншыя мячэці, разбураныя падчас пажараў – у Слоніме, Клецку, Мядзелі, але будынак патрабаваў рамонту. Вернікі сабралі грошы на новы дах для мячэці. Планавалася зрабіць яго цалкам бляшаным, часткова набылі матэрыялы, але да справы не дайшло. Ужо ў 1950-ыя ў даху з’явіліся першыя дзіркі ў гонце, якія спрабавалі захінуць бляхай.

У 1980-ыя гады ў Даўбуцішках працавала група даследчыкаў з Музея народнай ахітэктуры ў Строчыцах. У 1983 годзе былі зробленыя геадэзічныя даследванні, абмеры і фатаграфаванне. Пасля гэтага купал і галерэя абваліліся, але мінарэт яшчэ стаяў, хоць і моцна нахілены. Пры гэтым частка купала засталася вісець на ўсходняй сцяне будынка.

Навукоўцы правялі паўторныя абмеры, зрабілі фотаздымкі ўнутры і звонку, потым разабралі і перавезлі ў Строчыцы.

У 1989 годзе спецыялісты[41] падрыхтавалі праект аднаўлення мячэці, склалі каштарыс на 67 тысяч рублёў. Планавалася, што яна будзе узведзеная ў Строчыцах з 1990 да 1991 год, але да сённяшняга дня гэта не зроблена.



Стан мячэці ў 1970-ыя

Як аказалася падчас пракурорскай праверкі ў 2018 годзе, драўляныя элементы мячэці, перавезеныя ў Строчыцы, цалкам згнілі. Захаваліся толькі металічныя элементы і некалькі драўляных фрагментаў.

У 2016 годзе на падмурках мячэці ў Даўбуцішках ўсталявалі мемарыяльную шыльду з фатаграфіяй мячэці.

[41] Белорусский специализированный институт по разработке проектной документации для реставрации памятников истории и культуры «БелСпецПроектРеставрация».



Імам Якуб Мухля перад мячэццю



Выгляд з паўночнага боку

# Імамы

Архіўныя крыніцы[42] сведчаць, што ў 1588 г. імамам мячэці ў мястэчку Даўбуцішкі Ашмянскага павета быў кадзі Чэлебі Хаджы Мурзіч. У рэестры дакументаў на ўладанні ў Даўбуцішках, якія належалі князю Алікечу Бегімавічу Асанчуковічу Ўлану, складзеным 9 лістапада 1588 і 30 верасня 1592 г., маецца "ліст *Дэрвіш Чэлебі Кахадзі* Мурзіча, духоўніка татарскага даўбуцішскага і жонкі яго на 30 коп і 28 грошаў ...".

Ганаровы для мусульманіна тытул Хаджы (паломнік) сведчыць пра тое, што Мурзіч ажыццявіў Хадж. Назвы *дэрвіш* і *чэлебі* татарскі кадзі дадаў да свайго прозвішча, відаць, у Турцыі, дзе мог прабыць даволі доўга. *Дэрвіш* (персідск. "*бядняк, жабрак*") – гэта мусульманскі аскет, чалавек, які добраахвотна адмовіўся ад людскіх радасцяў і багацця, аддаўшы сваё жыццё на пазнанне Бога.

С. Крычынскі[43] лічыў, што кадзі Мурзіч "на працягу некаторага часу сапраўды быў членам брацтва дэрвішаў недзе ў Анатоліі..." Гэты гісторык таксама меркаваў, што менавіта Мурзіч мог быць аўтарам "Рысале-і-татары-лех".

У 1586 годзе, паводле актаў Літоўскай метрыкі, Мурзіч атрымаў прывілей ад караля на выкананне абавязкаў кадзі "ўсіх татараў ВКЛ"[44]. Пасада кадзі замацоўвалася за Мурзічам пажыццёва.

Варта адзначыць, што Мурзіч быў не першым кадзі ў ВКЛ. Ён атрымаў гэтую пасаду пасля смерці папярэдняга кадзі мясцовага ўзроўню Алея Абрагімовіча[45]. Рэестр Радзівілаў 1575 года паказвае, што пасада кадзі, якую і займаў Абрагімовіч, на той час ужо існавала. На жаль, нельга сказаць дакладна, быў ён імамам ў Даўбуцішках ці ў іншчым паселішчы.

Ужо ў 1598 годзе ў тэстамэнце арабскай пісаркі, жонкі харунжага Абрагама Айсіча, Айшы Алееўны Айсіч у м. Вавёры ў якасці сведкі сярод іншых знаных асобаў згадваецца імам мячэці ў Даўбуцішках Ахмэт Халецкі.

У 1688 годзе, паводле дакументаў роду Смольскіх, пададзеных імі для зацвярджэння ў шляхецтве, імамам у Даўбуцішках згадваецца Амурат Мураўскі.

У 1696 годзе ў якасці імама Даўбуцішак згадваецца Самуіл Хасеневіч Яблонскі[46].

У 1738 – 1741 гадах пасаду імама ў Даўбуцішках займаў Мустафа Мураўскі[47].

У гістарычных крыніцах і метрычных выпісах трапляецца імя імама ў канцы XVIII ст. – Іосіфа Мустафавіча Шалягоўскага.

---

[42] Акты літоўскай метрыкі пра татараў.
[43] S. Kryczynski, Tatarzy litewscy. Próba monografii historyczno-etnograficznej // Warszawa, 1938.
[44] A. Konopacki, Życie religijne Tatarów na ziemiach dawnego Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI – XIX wieku // Warszawa, 2010.
[45] S. Dumin, Urząd kadiego u tatarów w Wielkim Księnstwie Litewskim w XVI w. s świetle przywileju króla Stefana Batorego 1586 r. // Tożsamość a religia Tatarów WKL. Pod red. A. Konopackiego, Białystok, 2017.
[46] S. Dziadziulewicz. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce. Wilno, 1929
[47] Даваў метрыкі Смольскім

Перапіс 1795 года паказвае, што на мячэтным фундушы жыў імам Алей Іосіфавіч Шалягоўскі[48], сын папярэдняга імама, з жонкай Гэленай, дзецьмі Мустафой, Гэленай і Мяр’емай, нявесткай Фуршай і ўнукам Іосіфам. У іх была чэлядзь татары Саліх Якубоўскі і Асэя Нячай.

Пасаду муэдзіна займаў у гэты час Хасень Мустафавіч Сегадзінскі.

Якуб Іосіфавіч Лебедзь (нарадзіўся 10.02.1749) стаў імамам у Даўбуцішках у 1802 годзе. Паходзіў ён з Наваградка[49], займаў пасаду імама ў Багоніках, а ў 1796 годзе атрымаў медаль ад караля Прусіі, у склад якой увайшла тэрыторыя Беласточчыны. У 1823 годзе набыў у Мустафы Іванавіча Крычынскага фальварак Дзеракі (з землямі ў Мусіншчыне), дзе да нашага часу жывуць ягоныя нашчадкі. Менавіта ў гэты час у Даўбуцішках для вернікаў быў уведзены “пасошны” падатак памерам 2 злотыя штогод на догляд мячэці. Імам меў заробак 352 злотыя[50].

Паводле перапісу 1811 года, імам Лебедзь жыў у фальварку Даўбуцішкі, атрыманым ад Давыда Крычынскага. Пры двары ў яго служылі 3 чалавекі.

Якуб Лебедзь набыў стары Кур’ан у харунжага Давыда Сулькевіча 10 траўня 1812 года, на вольныя старонкі якога нашчадкі імама запісвалі метрычныя звесткі сваёй сям’і. Нашчадкі імама жылі ў Слоніме, Іўі, Маладзечне і Смаргоні, і нават у Аўстраліі.

Муэдзінам падчас кіравання імама Лебедзя быў Міхал Самуілавіч Радкевіч (1791 г.н.), а годжым – сын аднаго з папярэдніх муэдзінаў – Хасень Хасенявіч Сегадзінскі.

Невядома, да якога часу Лебедзь быў імамам (памёр 10.07.1829), але выдаваў метрыкі яшчэ ў 1819 годзе[51].

У тым жа 1819 годзе сярод шляхецкіх дакументаў Смольскіх згадваецца імам Даўбуцішак Азюль Сюляйманавіч Бяганскі. Вядома, што ён у гэты ж час служыў імамам[52] у Відзах – новай парафіі, якая ўтварылася ад Даўбуцішскай не так даўно. У 1816 годзе Бяганскі (ад нараджэння меў 40 гадоў) жыў у м. Крывічы Вілейскага павету і выконваў там абавязкі імама мясцовай парафіі[53]. Магчыма, ён выконваў абавязкі імама ў Даўбуцішках часова, пакуль тут не абралі новага.

Пасля Бяганскага імамам стаў Давыд Давыдавіч Александровіч, сын паручніка войска ВКЛ Давыда Шабанавіча Александровіча з Таўсюнаў. Александровіч выконваў свае абавязкі да 1835 года. 22 красавіка 1831 ён падпісаў заклік да вернікаў парафіі прыняць удзел у агульнапольскім паўстанні супраць расейскіх акупантаў.

Аляксандр Асанавіч Варановіч, што нарадзіўся 8 снежня 1779[54] года, заняў пасаду імама ў Даўбуцішках і выдаваў метрыкі ў 1835 – 1852 гадах. Ягоны ўнук

---

48 у арыгінале Szelęgowski.
49 Метрыка нараджэння Лоўчыцы.
50 Rocznik Tatarski, T. 3, 1938.
51 Метрыкі Абрамовічаў.
52 Без мячэці.
53 LVIA F515 A15 B444
54 Запіс аб нараджэнні А.А. Варановіча ў метрычнай кнізе м. Асмолава выканаў імам Ян Халямбек, метрыка выдадзеная імамам Аляксандрам Смольскім.

Ібрагім (1879 - 1936) у 1904 годзе выехаў у ЗША, дзе прымаў актыўны ўдзел у жыцці мусульманскай арганізацыі Нью-Ёрка. Іншыя нашчадкі імама жылі ў Даўбуцішках, Ласавічах, Загор'і, Іўі, Радашковічах, Паставах, выязджалі ў эвакуацыю ў Казань і Аранбург падчас Першай усясветнай. Нашчадак імама – Адам Радзецкі – зараз займае пасаду імама ў Іўі.

15 лістапада[55] 1862 года імамам стаў 29-гадовы Сялім Давыдавіч Лебедзь родам з вёскі Рэйжы. Ён нарадзіўся 6 лютага 1833 года ў сям'і Давыда Сюляйманавіча і Асэі з Асановічаў Лебедзяў[56]. Пазней ягоны бацька Давыд стане імамам у Рэйжах. Гэты род Лебедзяў доўгі час валодаў маёнткам Геркішкі ў Троцкім павеце, прададзеным у 1793 годзе Абрагаму Бараноўскаму. Пасля гэтага продкі імама жылі ў Перасецы пад Наваградкам, Мураўшчызне, Бутрыманцах і Немежы.

Сялім спраўдзіў шляхецтва ў 1862 годзе. Пэўны час (1876 - 1879) Сялім Лебедзь таксама выконваў абавязкі імама ў мядзельскай мячэці, пакуль там не абралі ўласнага імама.

С. Лебедзь меў жонку Айшу[57] з Александровічаў, а з дзяцей вядомыя імёны толькі дачок Лімы, Жанны і сына Міхала. Міхал (1860 - 1926) жыў у Дзераках, пахаваны на Ластаі. Ліма выйшла замуж за Саліха Багдановіча і жыла пад Трокамі. Жанна выйшла за Аляксандра Мустафавіча Гямбіцкага і жыла адразу ў Гальшанах, а затым у Дзясятніках.

У 1875 годзе ў доме імама здарыўся пажар, падчас якога згарэлі метрычныя кнігі і іншыя каштоўныя дакументы. Захаваўся дакумент, дзе павятовыя ўлады сведчылі, што ў паўстанні Каліноўскага імам ўдзел не прымаў.

Сялім Лебедзь выконваў свае абавязкі да трагічнай смерці ў 1887 годзе[58]. Пасля гэтага 1 чэрвеня 1887 года ў парафіяльным доме адбыўся сход вернікаў даўбуцішскай мячэці ў складзе 57 чалавек, на якім большасцю галасоў абралі імамам Мустафу Аляксандравіча Смайкевіча з Мінска, якому на той час было 33 гады.

---

[55] Памятная книжка Виленской губернии, 1888.
[56] Метрыка, выдадзеная імамам мячэці ў Рэйжах Мустафой Яблонскім у 1850 годзе.
[57] У іншых крыніцах Асэя.
[58] Быў забіты невядомымі асобамі, пасля чаго хворы сын учыніў пажар.



Імам М. Смайкевіч з сямёй

Таксама вернікі прасілі Ашмянскага павятовага спраўніка вярнуць новаабранаму імаму метрычныя кнігі Даўбуцішскай мячэці, забраныя ім пасля смерці С. Лебедзя.

27 лістапада 1887 года мусульмане аколіцы Мураўшчызна (Іўе) склалі ўласны акт, у якім выказалі згоду на абранне даўбуцішскімі вернікамі М. Смайкевіча імамам мячэці.

Нагадаем, што доўгі час вернікі Мураўшчызны ўваходзілі ў склад парафіі Даўбуцішкі, нават пасля пабудовы ў 1884 годзе ўласнай мячэці. Імамы мураўшчызнаўскай мячэці не мелі пячаткі, і гэта стварала пэўныя цяжкасці, бо даводзілася звяртацца ў ТМДУ.

Затым, паводле ўведзеных уладамі правілаў, вернікі Даўбуцішак звярнуліся ў ТМДУ каб зацвердзіць М. Смайкевіча на пасадзе імама. Для гэтага яны выбралі ўпаўнаважанага – 44-гадовага падпалкоўніка 106 Уфімскага полку Сяліма Эльяшавіча Крычынскага.

14 красавіка 1888 года С. Крычынскі падаў у ТМДУ зварот вернікаў наконт зацвярджэння М.Смайкевіча імамам, а 19 траўня 1888 ТМДУ накіравала ліст у Ашмянскую павятовую паліцэйскую ўправу (АППУ), у якім прасіла сабраць звесткі пра М. Смайкевіча – падсуднасць, лаяльнасць да ўлады, паводзіны і г.д. А таксама праверыць, ці складалі тыя асобы, што прымалі ўдзел

у выбарах імама, не менш за 2/3 ад колькасці ўсіх прыпісаных да мячэці вернікаў.

28 ліпеня 1888 года з Ашмянаў быў атрыманы адказ, што М.А. Смайкевіч цалкам адпавядае патрабаванням улады, а 12 красавіка 1890 – спіс вернікаў Даўбуцішкай мячэці, дзе пазначылі 42 чалавек са 106, якія карысталіся правам голаса. З іх 9 пражывалі ў мястэчку Вішнева сучаснага Валожынскага раёна, а 7 – у мястэчку Гальшаны сучаснага Ашмянскага раёна.

Іншыя мусульмане Даўбуцішскай парафіі, згаданыя ў спісе, жылі ў Цярэшках (2 асобы), Дзераках (2), Рымцелях (1), Касымаве (1), Чарнеўшчызне (1), Крэве (3), на Ластаі (6), у Бяргалішках (1) і Гаі (1).

Прааналізаваўшы лісты з АППУ, ТМДУ прыйшло да высновы, што ніякіх перашкодаў для Смайкевіча няма, і 7 чэрвеня 1890 года звярнулася ў Віленскую губернскую ўправу (ВГУ) з лістом, дзе прасіла зацвердзіць яго імамам і выслаць у ТМДУ акт зацвярджэння.

30 студзеня 1891 года губернскія ўлады зацвердзілі М. Смайкевіча на пасадзе імама, а 22 траўня АППУ напісала зварот да ВГУ, у якім прасіла накіраваць імама Віленскай Катэдральнай мячэці Мустафу Амуратавіча Багдановіча для прымання прысягі, бо “*іншых імамаў у Ашмянскім павеце не было*”. 11 ліпеня 1891 года новаабраны імам Мустафа Аляксандравіч Смайкевіч у Вільні перад Кур’анам урачыста даў прысягу на вернасць імператару і народу. Прымаў прысягу вышэйзгаданы М. Багдановіч.

Арыгінальны тэкст прысягі М. Смайкевіча

*Клятвенное обещание*

*Я, нижепоименованный, обещаюсь и клянусь Всемогущему Богу перед Священным Его Кораном в том, что хочу и должен ЕГО ИМПЕРАТОРСКОМУ ВЕЛИЧЕСТВУ, своему истинному и природному ВСЕМИЛОСТИВЕЙШЕМУ ГОСУДАРЮ ИМПЕРАТОРУ АЛЕКСАНДРУ АЛЕКСАНДРОВИЧУ, САМОДЕРЖЦУ ВСЕРОССИЙСКОМУ, и законному ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА Всероссийского Престола Наследнику НИКОЛАЮ АЛЕКСАНДРОВИЧУ верно и нелицемерно служить и во всём повиноваться не щадя живота своего до последней капли крови и всё к высокому ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА саможержавству сил и власти принадлежащия права и преимущества узаконенные и впредь узаконяемые по крайнему разумению сил и возможности предостерегать и оборонять и при том по крайней мере старатися споспешествовать все, что к ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА верной службе и пользе государственной во всяких случаях касаться может, о ущербе же ЕГО ВЕЛИЧЕСТВА интереса, вреде и убытке, как скоро о том уведаю, не токмо благовременно объявлять, но и всякими мерами отвращать и недопущать тщатися и всякую вверенную тайность*

*крепко хранить буду, и поверенный и положенный на мне чин, как по сей (генеральной), так и по особливой, определенной и от времени до времени ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА именем от предуставленных надо мною начальников определяемым инструкциям и регламентам и указам, надлежащим образом по совести своей исправлять, и для своей корысти, свойства, дружбы и вражды противно должности своей и присяги не поступать, и таким образом себя вести и поступать, как верному ЕГО ИМПЕРАТОРСКОГО ВЕЛИЧЕСТВА подданному благопристойно есть и надлежит, и как я перед Богом и судом Его страшным в том всегда ответ дать могу; как сущее мне Господь Бог душевно и телесно да поможет. В заключение же сей моей клятвы целую слова Священного Корана. Аминь.*

*Июня 11 дня 1891 года.*

Імам М. Смайкевіч у тым жа 1891 годзе прымаў прысягу ад Бякіра Мустафавіча Рафаловіча, абранага вернікамі імамам у Мураўшчызне ў 1889 годзе. Захаваліся таксама метрыкі, выдадзеныя Смайкевічам падчас службы.

Смайкевіч выконваў свае абавязкі ў Даўбуцішках нядоўга. Ужо 10 лютага 1897 года яго пастановай Мінскай губернскай управы (МГУ) накіравалі імамам у Мінск.

Таму 24 лютага 1897 вернікі Даўбуцішак мусілі правесці сход, на якім абралі імамам Аляксандра Мустафавіча Гямбіцкага з Гальшанаў. У акце аб абранні А. Гямбіцкага імамам паставілі подпісы 61 чалавек, якія таксама ўпаўнаважылі Мацея Карыцкага перадаць вынікі і заяву на зацвярджэнне ў ВГУ і ТМДУ. Парафіяне таксама прасілі Гямбіцкага пераехаць жыць з Гальшанаў у дом імама ў Даўбуцішках.


А. Гямбіцкі

Пра А. Гямбіцкага вядома толькі, што меў зямлю ў Гальшанах і ваколіцах, а таксама гарбарню. Меў жонку Жанну – дачку аднаго з папярэдніх даўбуцішскіх імамаў Сяліма Лебедзя і 6 дзяцей. Лёс яго нашчадкаў склаўся трагічна. Сына Сяліма (1880) забілі немцы ў Другую ўсясветную вайну, сын Міхал прыняў хрысціянства і перабраўся ў Польшчу. Дачка Сафія жыла ў Дзясятніках, працавала ў шпіталі ў Вішневе. Падчас Другой усясветнай вайны ратавала габрэйскіх дзяцей з гета, за што яе арыштавалі, вывезлі ў Валожын, дзе моцна скалечылі, і яна памерла. Дзе яе пахавалі, невядома.

Што да выканання абавязкаў, то Гямбіцкі сваю дзейнасць так і не пачаў,

бо ўжо 22 сакавіка 1897 года імамам выбралі іншага чалавека – Бякіра Мустафавіча Рафаловіча, які на той час служыў імамам у Мураўшчызне і пажадаў сам перавесціся ў Даўбуцішкі. 50 вернікаў, што ўдзельнічалі ў выбарах, упаўнаважылі муцівіля падпалкоўніка Мацея Мустафавіча Крычынскага передаць справу у ВГУ і ТМДУ. А 13 красавіка 1897 года парафіяне склалі акт выбараў Б. Рафаловіча за подпісам 25 чалавек.

Цяжка сказаць, што гэта была за гісторыя з выбарамі, бо ўжо 19 красавіка 1897 года вернікі за подпісам 35 чалавек склалі акт у ВГУ, дзе даводзілі, што Б.М. Рафаловіч заняў пасаду імама падманным шляхам – ён сказаў, што А.М. Гямбіцкі адмовіўся ад пасады і прасіў Б.М. Рафаловіча падаць сваю кандыдатуру на выбары. Так як А.М. Гямбіцкага не было на той момант у Даўбуцішках, тэлефонаў не існавала, а пошта працавала марудна, парафіяне не змаглі спраўдзіць словы А.М. Гямбіцкага і абралі Б. Рафаловіча імамам, паверыўшы яму.

Нязгодныя з Б. Рафаловічам пісалі, што словы Рафаловіча наконт адмовы А. Гямбіцкага былі хлуснёй. Ён забраў ключ ад мячэці і не пусціў туды Гямбіцкага. Вернікі прасілі ўлады выдаліць Б. Рафаловіча і вярнуць А. Гямбіцкага.

Разгляд гэтай справы ішоў досыць доўга. Так, 2 ліпеня 1897 года прыхільнікі Б. Рафаловіча ў складзе 38 чалавек падалі адозву да ВГУ, дзе прасілі зацвердзіць яго імамам, бо "А. Гямбіцкі не адпавядае да пасады імама, і парафіяне адмаўляюцца ад яго кандыдатуры на карысць Рафаловіча". Таксама сцвярджалі, што А. Гямбіцкі "*по ремеслу кожевенник, по профессии мелкий конский барышник, нравственными качествами тоже не отличается, малограмотен, груб и нахален в обращении. Смирения, которое подобает в сане духовном, в нём совсем нет. Кроме того, и что важнее всего, употребляет горячительные напитки вопреки нашим религиозным законам*". Сцвярджалі, што мусілі нават заплаціць Гямбіцкаму 80 рублёў за тое, каб ён адрокся ад пасады імама.

Гямбіцкаму нават не дапамагло пасведчанне годнасці, выдадзенае яму 1 верасня 1897 года знанымі ў Гальшанах асобамі, такімі як ксёндз К.Ю. Карповіч, святар праваслаўнай царквы, начальнік пошты Навашынскі, рабін М.С. Рабіновіч, галоўны лекар М.Т. Мушкат, псалміст царквы Павел Нарбутовіч, паліцэйскі ўраднік, стараста, купец і інш. Прыхільнікі А. Гямбіцкага (9 чалавек) 22 кастрычніка 1897 года накіравалі ліст у ТМДУ, дзе яшчэ раз паказалі, што абранне Б. Рафаловіча імамам незаконнае, і тыя, хто аддаваў за яго галасы, былі ўведзеныя ў зман.

Пакуль у Даўбуцішках вяліся гарачыя спрэчкі наконт абраных імамаў, бюракратычная машына працавала павольна. Так, ТМДУ больш за паўгода вяла ліставанне з павятовымі і губернскімі ўладамі, пакуль нарэшце Б.М. Рафаловіча 17 верасня 1897 года зацвердзілі імамам у Даўбуцішках. За яго ў рэшце рэшт падпісаліся нават тыя, хто першапачаткова падтрымліваў Гямбіцкага. Але нават у лютым 1899 года асобы, нязгодныя з Рафаловічам, рабілі спробы перагледзець вынікі выбараў.

Што да вернікаў аколіцы Мураўшчызна, то ім давялося абраць сабе новага імама Івана Якубавіча Шабановіча 3 красавіка 1898 года. Падчас пераезду Б. Рафаловіча з Мураўшчызны ў Даўбуцішкі былы імам забраў з сабою метрычныя кнігі аб немаўлятах, шлюбах і памерлых, таму новаабраны І. Шабановіч праз паліцыю патрабаваў вяртання іх у мячэць Мураўшчызны.

Б.М. Рафаловіч займаў пасаду імама да самай смерці ў 1926[59] годзе. Меў 2 жонак, з якіх вядома імя толькі адной – Розы з Сафарэвічаў[60]. Што да дзяцей, то дакладна вядомыя імёны толькі 2 дачок – Мяр’емы (1878 - 1937), якая выйшла замуж ў Іўе за Магамета Шабановіча, і Аміні, што была замужам за Стэфанам Аляксандравічам Паўтаржыцкім, землеўладальнікам ў Ласавічах, Крыўску і Даўбуцішках. Нашчадкі Мяр’емы, якіх каля 300 чалавек, складаюць на сённяшні дзень амаль палову татарскага насельніцтва Іўя.

Імам Рафаловіч пахаваны на мізары ў Даўбуцішках, а ў 2018 годзе на ягонай магіле і магілах ягоных жонак усталявалі новыя помнікі[61].




Магіла імама Б.М. Рафаловіча

Пасля Б.М. Рафаловіча пасаду імама ў Даўбуцішках займаў Якуб Адамавіч Мухля (1892 – 1937). Захавалася метрыка, падпісаная ім 3 траўня 1930 года. Да гэтага ён працаваў у Наваградку як годжы, а з 1926 па 1934 служыў у Даўбуцішках, пакуль не пераехаў у Відзы. Меў жонку Айшу Аляксандраўну з Александровічаў і дзяцей Аляксандра, Джамілю (1929 – 1950), Сафію і Мяр’ему Радкевіч. Ягоныя нашчадкі жывуць у Відзах, Мінску і Паставах.

---

59 Паводле С. Дзядзюлевіча. Гербоўнік татарскіх родаў у Польшчы. 1929, “Жыццё татарскае”, №12, 1937.
60 Імя ў метрыках смерці дачкі Мяр’емы ў Мураўшчызне ў 1937 годзе.
61 З фундацыі праўнука, муфтэя МРА А.-Б.Ю. Шабановіча



Імам Якуб Мухля з жонкай Айшай



Імам Лют Мухля

Пасля Я. Мухлі імамам у 1934 годзе стаў ягоны сваяк Лют Адамавіч Мухля. Ён нарадзіўся ў 1902 годзе ў в. Сідры пад Саколкай (зараз тэрыторыя Польшчы), падчас Першай усясветнай з сям'ёй быў у эвакуацыі ў Казані, дзе атрымаў у тым ліку і рэлігійную адукацыю. У 1922 годзе вярнуўся, працаваў у м. Свіслач, што каля Ваўкавыска.

У 1929 годзе Л. Мухля стаў настаўнікам рэлігіі ў м. Скідаль, потым муэдзінам у Крушынянах, служыў імамам у Некрашунцах, Лукішках[62], а затым быў накіраваны ў Даўбуцішкі. Займаў гэтую пасаду да пачатку Другой усясветнай вайны, затым пераехаў у Некрашунцы. У 1946 годзе па праграме рэпатрыяцыі выехаў у Польшчу, дзе працягваў рэлігійную і асветніцкую дзейнасць да смерці ў 1979 годзе. Вядомы таксама як укладальнік некалькіх хамаілаў. Меў жонку Еву, бацька якой, Алей Давыдавіч Ільясевіч, уладальнік маёнтку Тэадорава, здзейсніў Хадж, ахвяраваў сродкі на мячэць у Коўне. Дзеці Люта і Евы – Таміра Паўтаржыцкая і Фарыда Шагідэвіч. Ягоныя нашчадкі зараз прымаюць актыўны ўдзел у культурным жыцці польскіх татараў.

Падчас вайны і да 1948 года, ужо за савецкім часам, маючы афіцыйны дазвол на рэлігійную дзейнасць, пасаду імама ў Даўбуцішках займаў Алі Самуілавіч Рафаловіч (1905 – 1999), якога называлі "Маршалак". Ён нарадзіўся ў Іўі, але рана застаўся без бацькоў. Меў першую жонку Аміню Магаметаўну Смайкевіч (1906 – 1935) з Наваградка, другую жонку Азыму Аляксандраўну Якубоўскую (1915 – 1971) з Крэва і шмат дзяцей. Пасля 1944 года жыў з сям'ёю ў парафіяльным доме ў Даўбуцішках і вымушаны быў плаціць падатак як імам. У 1948 годзе выехаў у Наваградак на радзіму першай жонкі. Там, у Наваградку, выконваў абавязкі імама разам з Якубам Сюляйманавічам Шчансновічам увесь пасляваенны перыяд. Штогод наведваў паселішчы былой парафіі (Крэва, Паляны, Ластая і іншя), дзе праводзіў малітвы, азаны і г.д.

[62] У 1936 годзе як імам на Лукішках даваў шлюб паручніку Міхалу Шумскаму і Айшы Муха



Імам Алі Рафаловіч

Падчас кіравання Л. Мухлі і А. Рафаловіча ў якасці імамаў даўбуцішкай парафіі муэдзінам быў Мустафа Давыдавіч Радкевіч (1893 – 1978), які жыў на горцы насупраць мізара праз раку Драя. Нарадзіўся ён у Мінску, удзельнічаў у захопе Зімовага палаца ў Пецярбургу ў 1917 годзе, а потым перабраўся ў Даўбуцішкі. Ажаніўся ў 1928 годзе ў Іўі з Мяр'емай Ібрагімаўнай Шабановіч, меў 4 дзяцей. З ім у гэтым жа доме жыла маці Танзіля і брат Ях'я.

Да вайны дзяцей вучыла і гаджыня Мількамановіч, якая жыла ў Ласавічах, а таксама Гамбер Іванавіч Рафаловіч з Іўя, які да гэтага выконваў абавязкі імама ў Сорак татар на пачатку 1920-ых гадоў. Былы муэдзін М. Радкевіч выконваў абавязкі імама ў пасляваенны перыяд. Часам на дні памяці прыязджаў і былы імам Алі Рафаловіч з Наваградка.



Муэдзін Мустафа Радкевіч

Пасля 1991 года парафія ў Даўбуцішках не арганізавалася, бо мячэць разабралі, і бракавала вернікаў, якія да таго ж жылі ў розных раёнах – у Даўбучках, Маладзечне, Палянах, Дзясятніках, Сіньках, Гальшанах, Ашмянах, Сяльцы, Смаргоні, Загор'і, Крэве. Мусульманскія суполкі з'явіліся толькі ў Маладзечне і Ашмянах пасля 1994. Даўбучкі, дзе засталіся толькі 3 хаты, з мізарам увайшлі ў склад парафіі Маладзечна.

***Ластая***

Даўбуцішская мячэць мела асобны філіял у фальварку Ластая. Там знаходзілася малітоўнае памяшканне у доме муэдзіна.

Пасаду муэдзіна ў 1795 годзе тут займаў Біляль Данілавіч Чымбаевіч (1759 г.н.), сын паручніка і ўладальнік Ардашоў. Затым, у 1816 годзе, на пасадзе муэдзіна згадваецца ўжо ягоны сын Мустафа Білялевіч Чымбаевіч (1788 г.н.).



На зломе XIX – XX ст. муэдзінам на Ластаі быў Леон Ібрагімавіч Александровіч (1872 – 1942). А 26 жніўня 1912 года вернікі Даўбуцішскай парафіі, што пражывалі на Ластаі, паводле прапановы муцівіля палкоўніка Сяліма Ільіча Крычынскага адзінагалосна яго пераабралі. Ён быў сынам папярэдняга муэдзіна на Ластаі – Ібрагіма Якубавіча Александровіча (з 1855 па 1891 гады). Подпісы паставілі татары ўладальнікі маёнткаў на Ластаі – Ахматовічы, Сулькевічы, Крычынскія, Талькоўскія, Паўтаржыцкія, Шчуцкія і іншыя мясцовыя мусульмане.

Леон Александровіч меў жонку з Наваградка – Аніфу Іосіфаўну Сафарэвіч (1880 – 1953), сястру камісара Абастуманскага ваеннага шпіталю Аляксандра Сафарэвіча. Леон і Аніфа мелі дзяцей Аміню Ждановіч у Вішневе, Мяр’ему Мусіч і Эльміру Курмановіч у Ардзе.

У абавязкі муэдзіна ўваходзіў догляд за мізарам, выкананне рэлігійных мерапрыемстваў пры адсутнасці імама з Даўбуцішак. Муэдзін мусіў маліцца за душы памерлых Сулькевічаў, якія ахвяравалі вакуф пад мізар, а таксама вучыць дзяцей. За гэта ён меў права карыстацца вакуфам у 8 дзесяцінаў з ворнай зямлёю і паплавамі на левым беразе ракі Ластаянка. Пры гэтым, на вакуфнай зямлі ўжо знаходзіліся дом і гаспадарчыя пабудовы ў прыватнай уласнасці муэдзіна.



Муэдзін Бякір Мусіч

Пасля смерці Л. Александровіча ў 1942 годзе пасаду муэдзіна заняў ягоны зяць, Бякір Амуратавіч Мусіч. Ён быў родам з вёскі Арда і пэўны час жыў у Клецку. Выконваў абавязкі на Ластаі да гвалтоўнага перасялення ў Крэва ў 1950-ыя гады[63].

Бякір і Мяр’ема Мусічы мелі дзяцей Сяліму Паўтаржыцкую ў Наваградку і Лілію ў Мінску. Дом Мусічаў у Крэве захаваўся і належыць нашчадкам муэдзіна.

У міжваенны час на Ластаі дзейнічала суполка культурна-асветніцкай арганізацыі татараў як філіял цэнтральнай у Вільні.

У пасляваенны час на мізары штогод праводзіліся дні памяці, дзе абавязкі муэдзіна выконвалі Алі Рафаловіч, а таксама татары з Іўя, Крэва, Дзясятнікаў і інш.

На сённяшні дзень мізар на Ластаі належыць мусульманскай парафіі Ашмяны.

***Дзясятнікі***

Яшчэ адным цэнтрам татарскага асадніцтва ў Даўбуцішскай парафіі было мястэчка Дзясятнікі з навакольнымі паселішчамі Багданава, Зафінова і Вішнева. Жыхары гэтых паселішчаў належалі да філіялу на Ластаі. Абавязкі муэдзіна ў Дзясятніках у пасляваенны час выконвалі Мустафа Шабановіч і Давыд Халілявіч Шабановіч. Іосіф Хасенявіч Якубоўскі вучыў дзяцей.

***Паляны***

У Палянах была таксама моцная суполка татараў. Тут жылі сем’і 4 братоў Шабановічаў з Дэлятычаў – Самуіла, Мустафы, Якуба і Алея, якія нарадзіліся ў Іўі. Былі добра навучоныя, таму выконвалі абавязкі муэдзінаў і годжых.

[63] Л. Мусіч. Былая слава Ластаі. Байрам, №43.

# Мізары

На тэрыторыі Даўбуцішскай парафіі была найбольшая колькасць мізараў сярод мусульманскіх суполак былога ВКЛ. Так, паводле календара 1938 года, тут былі дзейныя мізары ў Даўбуцішках, на Ластаі і нядзейныя на Ластаі, у Паўтароўшчыне, Войцерах, Гамзічах, Войташах, Дзяраках, Рымцелях, Паніззі, Загор'і, Каскевічах, Капланах, Палянах, Яцкевічах, Сяльцы, Войнічах, Панарцы, Олькавічах. Такая колькасць мізараў тлумачыцца тым, што татарскія паселішчы былі размеркаваныя па вялікай плошчы і ўзніклі яшчэ ў сярэднявеччы.

Этнаграфічныя экспедыцыі па Смаргоншчыне і Ашмяншчыне ў 2012 – 2019 гадах дапамаглі выявіць толькі 6 мізараў былой парафіі.

***Даўбуцішкі***

Даўбуцішскі мізар знаходзіцца на шляху з Сінькоў на Сялец, на левым беразе ракі Драя[64]. Па плошчы займае каля 0,5 га. Абгароджаны драўляным плотам яшчэ у першай палове XX ст. Пасля вайны з рамонтам плоту дапамагаў калгас. На 2011 год плот амаль цалкам рабурыўся, таму вырашылі ставіць новы, бетонны. Мізар мае два ўваходы – з паўднёвага і паўночнага бакоў[65]. Меў металічную брамку на каменных слупах, і на сённяшні дзень захаваўся толькі адзін слуп. Каардынаты N54,348673° E26,439232°.

На мізары пахаваныя як простыя мусульмане з даўбуцішскай парафіі, так і ўладальнікі навакольных маёнткаў – Крычынскія, Сулькевічы, Талькоўскія і інш.

Перапіс пахаванняў на мізары праведзены ў 2015 годзе, дапоўнены ў 2018. Колькасць пахаванняў з надпісамі каля 200. Найстарэйшыя з іх датаваныя канцом XVIII ст.

***Ластая***

Ластайскі мізар[66] знаходзіцца на зарослым лесам пагорку справа ад дарогі Ардашы – Куты. Каардынаты N54,235629° E26,251620°. Аточаны глыбокім ровам, не абгароджаны. Уваход з паўднёвага боку, ад брамы засталіся 2 бетонныя слупы. З паўночнага боку да дарогі Ардашы-Куты да мізара вядзе часовая сцежка. На тэрыторыі мізара захаваліся 2 бетонныя абарочныя збудаванні часоў Першай усясветнай вайны. Тады ж ад мястэчка Баруны да Ластаі падчас Першай сусветнай была праведзеная лінія вузкакалейнай чыгункі.

На мізары каля 300 пахаванняў. Дзейны.

У канцы 1990-ых гадоў мізар пацярпеў ад хцівых асобаў, што займаліся вырабам помнікаў. Яны павалілі стэлу імама Аляксандра Гямбіцкага, а надмагіллі Туган-Бараноўскага, Ільясевіча і інш. вывезлі.

[64] За часам Рэчы Паспалітай мела назву Здра, Здрая, потым Драй.
[65] З паўночнага боку арганізаваны пад'езд на транспарце.
[66] Паводле мясцовага вымаўлення - "Мізяр".

Побач з дзейным мізарам, на паўднёвы захад, у тым жа гаі, знаходзіцца стары нядзейны мізар. Тут можна заўважыць надмагільныя камяні без надпісаў.

На старых мапах пазначаны яшчэ адны могілкі ў лесе насупраць дарогі Ардашы-Куты. Там пляц аточаны неглыбокім ровам, але слядоў пахаванняў не захавалася. Нельга сказаць, быў гэта мізар або хрысціянскія могілкі.

Яшчэ адзін старажытны мізар на Ластаі быў знішчаны падчас Першай сусветнай вайны. Камяні пайшлі на абарончыя збудаванні[67].

Сляды мізара былі яшчэ ў міжваенны час на тэрыторыі зямельных уладанняў Леона Сулькевіча бліжэй да вёскі Тупчы[68].

У літаратуры згадваюцца мізары каля былых маёнткаў Бяргалішкі[69], Гарэцкаўшчына, у Кутах і інш.

Варта адзначыць, што на Ластайскіх землях знаходзяцца могілкі Першай сусветнай вайны ў Кутах, а таксама вялікія хрысціянскія могілкі на поўнач ад в. Радзюкі.

***Олькавічы***

Мізар знаходзіцца за 100 м. на поўдзень ад вёскі Олькавічы, што на шляху з Ашмянаў на Баруны. Заснаваны на пачатку XX ст. ашмянскімі татарамі і доўгі час не выкарыстоўваўся, таму ў календары 1937 года пазначаны як нядзейны. Пахаванні праводзіліся рэдка, бо ашмянскія татары перавагу аддавалі мізарам у Іўі і на Ластаі. У 1990-ыя гады наведзены парадак на мізары, які да гэтага часу моцна зарос, усталяваны драўляны плот. Каардынаты N54,401032° E26,025243°. Большая частка пахаванняў, якіх каля 40, без помнікаў. Належыць мусульманскай парафіі Ашмяны. Дзейны.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Абрамовіч Тамара Аляксандраўна | | 2018 | з Якубоўскіх, м. Мяр’ема |
| Александровіч Айша Магаметаўна | 1930 | 1993 | 2 м. Шчуцкі, м. Мяр’ема, муж Алік |
| Александровіч Іосіф Барысавіч | 1896 | 1971 | м. Ева, Вішнева |
| Барадзіна Марыя Іванаўна | 1920 | 1993 | з Радлінскіх. Першы м. Якубоўскі, м. Азыма |
| Гямбіцкі Хасень Хасенявіч | 1875 | 1961 | |
| Мількамановіч Мяр’ема | | | ж. 65, м. Самуіл, дачка Гэлена |
| Паўтаржыцкая Аўгіня Мустафаўна | 1910 | 1965 | з Якубоўскіх, м. Зоня, муж Алей |
| Паўтаржыцкі Алей Мустафавіч | 1904 | 1969 | з Ласавіч, ж. Аўгіня, м. Эмілія |
| Радлінская Мяр’ема Якубаўна | 1914 | 1984 | муж Ях’я, м. Азыма |
| Радлінскі Іскандэр Іванавіч | | 2020 | ж. Зіна, маці Мяр'ема |

[67] Kryczynski, Leon. Dobra Łostajskie: (1600 - 1789), Wilno, 1930.
[68] Там жа.
[69] Там жа.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Радлінскі Якуб Іванавіч | 1956 | 1956 | м. Мяр’ема |
| Радлінскі Ях’я Халілявіч | 1900 | 1979 | ж. Мяр’ема, м. Асэя |
| Рызвановіч Зінаіда Сямёнаўна | 1900 | 1987 | сын Леон, муж Міхаіл |
| Рызвановіч Леанард Міхайлавіч | 1921 | 1954 | ж. Айша, м. Зіна, д. Роза |
| Рызвановіч Мяр’ема | | | ? |
| Хасяневіч Галіна Амуратаўна | 1921 | 1981 | муж Мустафа, з Якубоўскіх |
| Хасяневіч Мустафа Адамавіч | 1911 | | ж. Галя, са Смілавічаў |
| Шабановіч Раман Давыдавіч | 1940 | 2002 | м. Азыма |
| Слабкоўская Галіна Іванаўна | 1937 | 2019 | м. Халіма |
| Якубоўская Асэя | | | |
| Якубоўская Зоня | | | муж Мустафа |
| Якубоўская Разалія Самуілаўна | 1907 | 1980 | д. Марыя, агароджа |
| Якубоўскі Амурат | | | ж. Роза |
| Якубоўскі Михаил | | | ж. Зюня |
| Якубоўскі Мустафа | | | з в. Сорок Татар, ж. Зоня |
| Якубоўскі Раман | | | брат Хасень стаў Ікубоўскі, першая ж. Роза Радкевіч, сын ад другой ж. Аляксандр |
| Якубоўская Танзіля | 1873 | 1933 | |

***Сялец***

Адзін з найбольш старажытных мізараў парафіі, што захаваліся да нашага часу. Знаходзіцца за 100 м. на ўсход ад вёскі Сялец на высокім пагорку сярод поля каля школы. Не абрагоджаны, засмечаны, моцна зарос лесам. Каля 30 пахаванняў, з надпісамі толькі адно[70]. Каардынаты N54,359330° E26,376027°.

***Паляны***

Знаходзіцца ў цэнтры вёскі, парос дрэвамі і хмызняком. Закладзены ў першай палове XX ст. Моцна пашкоджаны падчас здабычы пяску ў пасляваенны час. Захавалася толькі адно пахаванне – Алены Чымбаевіч. Каардынаты N54,277375° E26,744876°.

***Паўтароўшчына***

[70] Надпіс шахада.

Вёска вядомая найперш тым, што тут знаходзяцца нямецкія вайсковыя могілкі часоў Першай усясветнай вайны.

Мізар знаходзіўся на поўнач ад вёскі на невысокім пагорку пры самай дарозе і пазначаны на некаторых мапах міжваеннага перыяду. Даследаванне паказала, што захаваліся сляды пахаванняў, але без надмагільных камянёў. Не абгароджаны, нядзейны. Праз мізар праходзіць дарога для сельскагаспадарчай тэхнікі.

Каардынаты N54°20'52,79" E26°13'11,51".

***Дзяракі***

У літаратуры згадваецца, што пад Дзяракамі былі два старажытныя мізары – на адным раней хавалі татараў, а на другім – іхных жонак каталічак[71].

Паводле мясцовых жыхароў, адзін з мізараў у Дзяраках існаваў яшчэ пэўны час пасля Другой усясветнай вайны. Знаходзіўся злева ад дарогі Мысіншчына – Дзяракі каля воданапорнай вежы. На ім былі пахаванні з надмагільнымі камянямі з надпісамі. Быў зааранны ў 1970-80-ых гадах. Падчас экспедыцыі 2017 года слядоў мізараў не знайшлося.

Каардынаты N54°18'40,35" E26°27'54,29".

***Гамзічы***

Мізары каля вёскі Гамзічы знішчаныя падчас пабудовы новай шашы Мінск – Вільня перад Алімпіядай 1980 года. Экседыцыя выявіла толькі старажытныя каталіцкія могілкі пры шашы. Вядомы гісторык У. Прыхач сцвярджае, што гэтыя могілкі былі закладзеныя побач са старажытным мізарам, і захавалася некалькі сафаў мусульманскіх пахаванняў. Каардынаты N54°21'08,77" E26°10'51,41".

Яшчэ адзін мізар, паводле У. Прыхача, знаходзіўся бліжэй да вёскі Мірклішкі, каля былога паселішча Смалярня. Камяні з яго выкарыстоўвалі падчас Першай сусветнай на пабудову бетонных абарончых збудаванняў. А канчаткова знішчылі падчас пабудовы новай шашы на Вільню. Прыкладныя каардынаты: N54°21'31,24" E26°09'58,65".

***Гарэцкаўшчына***

Паводле літаратурных звестак, мізар знаходзіўся ў лесе на поўнач ад былога маёнтка Гарэцкаўшчына. Стан невядомы.

***Вавёры***

Мізар быў закладзены яшчэ падчас Рэчы Паспалітай. Першапачаткова знаходзіўся сярод палеткаў за 500 м. на паўднёвы захад ад цэнтра паселішча. У пасляваенны час з ростам вёскі з’явіліся новыя вуліцы, і на сённяшні дзень мізар апынуўся на вуліцы Камсамольскай паміж дамамі 30 і 32. На мізары быў пабудаваны дом, які пазней згарэў.

---

[71] Паводле часопіса Rocznik Tatarski.

Тэрыторыя мізара моцна засмечаная, зарасла хмызняком. Захаваліся 2 надмагільныя камяні, з якіх надпісы толькі на адным. Дата пахавання 1767 год.

Найбольш верагодна, што тут было сямейнае пахаванне ўладальнікаў маёнка Вавёры – Юшынскіх. Яны валодалі тут землямі яшчэ ў першай палове XIX ст.



## Жыхары

На сённяшні дзень цяжка сказаць, колькі татараў жыло ў Даўбуцішках і наваколлі, бо статыстычных звестак, метрычных запісаў мячэці і іншых дакументаў захавалася няшмат. Так, мусульманскі каляндар за 1938 год падае звесткі, што парафія Даўбуцішкі складалася з 408 вернікаў. Прааналізаваўшы інфармацыю ад былых жыхароў і іх нашчадкаў, паспрабуем апісаць стан аколіцы ў ХХ ст.

***Даўбуцішкі***

Непасрэдна ў Даўбуцішках было 5 гаспадарак, з якіх захаваліся 2. Парафіяльны дом стаяў насупраць мячэці праз дарогу на Ласавічы. Складаўся з дзвюх частак – у першай была школа, дзе дзецям выкладалі асновы рэлігіі, а ў другой палове жыў годжы ці імам. Тут жа праводзілі сходы, мерапрыемствы.

У пасляваенны час у парафіяльным доме жыла адзінокая татарка Зіна Самуілаўна Гямбіцкая (Радкевіч) (“Зінка Чорная”) (1909 - 1993), якую сваякі Радкевічы прывезлі з-пад м. Ілья падчас вайны. Жыла з таго, што садзіла агарод і прадавала ў Смаргоні ўраджай, у тым ліку яблыкі і грушы з саду каля парафіяльнага дома. Пасля разбурэння парафіяльнага дома яна жыла ў суседзяў Радкевічаў і Рафаловічаў. Ейны муж быў Сюляйман Хасенявіч Гямбіцкі (1905 - 1980), родам з Бягомля. Зараз на месцы дома садзяць агароды.



Імам Лют Мухля з вернікамі

Ля парафіяльнага дома стаяў адзін з будынкаў школы, пазней разабраны.

На правым беразе ракі Драя, дзе зліваюцца два ручаі, на ўзгорку знаходзіўся маёнтак Крычынскіх. Тут жыў палкоўнік Сялім Ільіч Крычынскі (1843 - 1916), які выконваў ролю муцівіля для парафіі. Меў жонку Сюзанну Давыдаўну Талькоўскую з Ластаі і дзяцей Ніяру Базарэўскую, Аляксандра, Зіну Візіраву і Стэфана. Падчас войнаў 1914 – 1921 гадоў сям'я пераехала ў Крым. Затым Ніяра апынулася ў Францыі, Аляксандр апошні раз выходзіў на кантакт з Югаславіі, Зіна трапіла ў Азербайджан. Ад былой сядзібы ў Даўбуцішках на сённяшні дзень захаваліся толькі рэшткі вадзянога млына, а на тэрыторыі стаяць дамы жыхароў в. Ласавічы.

На захад ад крыніцы ў атачэнні дрэваў стаяў дом, дзе жыў Алей Шабановіч (1901 - 1942). Ягоныя бацькі былі Сюляйман Самуілавіч Шабановіч (з 28.11.1896 справавод 2-га стала губернскай управы ў Вільні, 1862 – 1917, маці Аміня) і Роза Аляксандраўна з Паўтаржыцкіх (1878 – 1950, маці Шарыфа). Бацька Розы, Алей Іванавіч Паўтаржыцкі, быў калегіяльным асэсарам, меў шмат зямлі ў розных фальварках Ашмянскага павету. Бацькі Розы пахаваныя на мізары ў Даўбуцішках. Што да Алея Сюляйманавіча Шабановіча, то ён меў яшчэ сястру Барые (1892 - 1982), якая была першы раз замужам за гісторыкам Джамілем Аляксандравічам Александровічам, а другі – за Ўмерам Вейрадскім, які паходзіў з крымскіх татараў.

Падчас Першай усясветнай вайны ўся сям'я: Сюляйман, Роза, Алей і Барые з мужам Джамілем, а таксама брат Сюляймана – Аляксандр, накіравалася ў эвакуацыю. Сюляйман і Аляксандр трапілі ў Тамбоў, дзе пэўны час працавалі. Падчас вяртання на радзіму Сюляйман памірае, і яго хаваюць на мінскім мізары. Алей трапляе ў Крым, дзе знаходзіць сваю першую жонку Ганну Аляксееву, дачку былога царскага наглядчыка ў Ялце. Джаміль Александровіч у 1918 становіцца загадчыкам аддзелу адукацыі Крыма, затым выязджае ў Азербайджан, дзе працуе ў археалагічным камітэце. У 1931 годзе ён згадваецца ў Самаркандзе, а далейшы лёс невядомы. Аляксандр вярнуўся ў Іўе, жыў у доме справа ад мячэці і выконваў там абавязкі імама з 1935 па 1937 год.

У 1922 годзе Роза і Алей з сям'ёй вярнуліся ў Даўбуцішкі. У Алея нарадзілася дачка Ніяра, а жонка Ганна выехала ў Францыю да сястры, дзе і засталася. Алей ажаніўся другі раз з Зінай з Мяцельскіх, якая прыняла Іслам і стала Заіра. У іх у Даўбуцішках нарадзіліся дзеці Аляксандр, Ліля і Руслан. Маці Алея, Роза, жыла з імі, дапамагала гадаваць дзяцей. Сям'я жыла багата, бо мелі шмат зямлі. За гэта і пацярпелі падчас вайны, калі ў 1942 годзе невядомыя забілі Алея. Перад гэтым, у 1939, гаспадарку разрабавалі. Пахаваны ён на мізары ў Даўбуцішках пры самай мячэці. Пазней, у 1990-ыя гады, да помніка была прымацаваная металічная шыльда з тэкстам.

Ніяра выйшла замуж за Олюся Якубавіча Якубоўскага з Крэва, і сям'я пераехала ў Свянцяны разам з Розай Шабановіч. У Ніяры і Олюся нарадзіліся дзеці Якуб, Экрэм, Ольгерд і Алей. Ніяра і Олюсь пахаваныя на мізары ў

Немежы, Роза Шабановіч – на мізары ў Мількунах, а Барые, якая вярнулася да маці, пахавалі на мізары ў Свянцянах.

У пасляваеннны час дзеці Барые, што жылі ў Азербайджане і Маскве, наведвалі сваіх родных у Даўбуцішках і Іўі.

Што да другой жонкі Алея Шабановіча – Зіны (Заіры) – то яна з дзецьмі трапіла ў Казахстан. Дачка Ліля жыла ў Маскве. Такім чынам, нікога ў гаспадарцы Шабановічаў у Даўбуцішках не засталося.

Дом муэдзіна Мустафы (1893 – 1978, сына Давыда і Танзілі) Радкевіча стаяў на ўзгорку за 100 м. на поўдзень ад мізара. Мустафа меў жонку Мяр'ему Ібрагімаўну Шабановіч (1908 - 1983) з Іўя, якая была стрыечнай сястрой івейскага імама Самуіла Шабановіча і вышэйзгаданага Алея Шабановіча, які жыў у Даўбуцішках. У Мустафы і Мяр'емы былі дзеці Зейнаб Ільясевіч, якая жыве ў Мінску, Роза Радкевіч у Даўбуцішках, Энвер, што ажаніўся ў Іўе, і Ібрагім. Пасля таго, як памерла жонка муэдзіна, хату набыў калгас для сваіх работнікаў. Яны выпівалі, разбуралі плот вакол мізара і палілі дошкамі печ. Падчас пажару дом згарэў цалкам. Зараз на ягоным месцы засталася толькі яма ад склепа і дрэвы навокал.

У Мустафы быў брат Ях'я, які жыў у другой палове дома. Меў жонку Мяр'ему Сюляйманаўну Рафаловіч[72] з Іўя. Іх дзеці – Аляксандр, Джаміль, Фарыда, Раман, Заіра. Пасля вайны перасяліліся ў Радашковічы, а затым у Іўе. Яўчэ адзін брат муэдзіна Бякір выехаў у Польшчу. З муэдзінам да самай смерці ў 1957 годзе жыла ягоная маці Танзіля.

У муэдзіна М. Радкевіча таксама была сястра Айша, якая выйшла замуж за Самуіла Сюляйманавіча Шабановіча ў Іўе. Жылі ў Іўі, Дэлятычах, а затым у Палянах[73].

Два дамы, што захаваліся на сённяшні дзень, належалі 2 братам – Адаму і Якубу Мустафавічам Радкевічам з іншай лініі роду Радкевічаў. Адам (1895 - 1981) меў жонку Мяр'ему Іванаўну Макуловіч (1894 - 1975) са шляхецкай сям'і і дзяцей Яна і Аляксандра ў Даўбуцішках, Фаіну Рафаловіч і Сафію Лебедзь ў Рымцелях і Ніяру Шчуцкую ў Мінску. Аляксандр (1926 - 2012) ажаніўся з Розай (1929 - 1994), дачкой муэдзіна Мустафы Радкевіча, меў дзяцей Лілію, Сафію, Барыса, Рамана і Аляксандра. Аляксандр (1926 - 2012) быў апошнім жыхаром Даўбуцішак. На сённяшні дзень у доме ўлетку збіраюцца нашчадкі, садзяць агарод і даглядаюць гаспадарку.

Суседні дом – брата Якуба (1907 - 1975), што меў жонку Гэлену Хасеняўну Гямбіцкую з Цярэшак і сына Мустафу – пазней старшыню мусульманскай парафіі ў Іўі. Зараз дом належыць Адаму Рафаловічу, сыну Фаіны Радкевіч з Рымцеляў, які займаў пасаду старшыні мусульманскай парафіі ў Маладзечне да 2019 года. Тут таксама жыла Зіна пасля зносу парафіяльнага дома.

У гэтых двух дамах на сённяшні дзень збіраюцца падчас дзён памяці татары з усіх куткоў Беларусі і Літвы.

[72] Нарадзілася ў Іўі, з бацькамі выехала ў ЗША, адкуль вярнулася з маці і сёстрамі.
[73] гл. Паляны

Але асноўная частка вернікаў даўбуцішскай парафіі жыла ў іншых паселішчах - у Цярэшках, Сіньках, Ласавічах, Загор'і, Дзераках, Рымцелях, Сяльцы, Палянах і г.д. Да падпарафіі на Ластаі належалі мусульмане з н.п. Янушы, Ластая, Куты, Бергалішкі, Крэва, Дзясятнікі, Вішнева, Гальшаны, Зафінова і інш.

***Ласавічы***

У Ласавічах жылі Ільясевічы і Паўтаржыцкія, а раней - Варановічы. Так, Сялім Хасенявіч Ільясевіч (1882 – 1957) меў жонку Розу Іосіфаўну (1892 - 1969) і дзяцей Эльміру, Сяліма, Хасеня і Галіну. Эльміра выйшла за Мустафу Бякіравіча Якубоўскага ў Іўе, Галіна – таксама ў Іўе за Бякіра Шабановіча. Хасень быў двойчы жанаты, у тым ліку з Аміняй Альбертаўнай Шабановіч з Іўя. Перабраўся таксама ў Іўе. Сялім-малодшы меў дзяцей Еву (м. Мустафа Ях'евіч Шабановіч) у Іўі, Іосіфа і Геру. Сялім пахаваны ў Іўі, а бацькі – ў Даўбуцішках. Сваякі Сяліма-старэйшага, Ільясевічы, жылі ў Капланах, а сваякі Лебедзі ў Дзяраках.

Паўтаржыцкі Мустафа (Стэфан) Аляксандравіч, кога называлі "Хохлік", паходзіў з багатай сям'і Паўтаржыцкіх з Наваградка, пра якіх напісана вышэй. Валодаў землямі ў ваколіцах Крэва – у Крыўску, урочышчах Чарняўшчына і Лапашнік, а таксама ў Ласавічах. Любіў гуляць у карты. Пахаваны з жонкамі на мізары ў Даўбуцішках, але помнікі без надпісаў. Меў ад першай жонкі Аміні Бякіраўны Рафаловіч (дачкі былога імама) дзяцей Іосіфа, Аляксандра, Ніяру і Бякіра. Ад другой жонкі, Айшы Якубаўны Радкевіч з Даўбуцішак, сына Якуба.

Сын Іосіф ажаніўся з Зінай Аляксандраўнай Смольскай з-пад Мядзела, меў дачку Зою, якая затым выйшла замуж за Гямбіцкага Аляксандра Самуілавіча з Мінску. Да вайны Іосіф трапіў у войска, служыў на захадзе Польшчы, дзе і застаўся, ажаніўся другі раз з полькай і меў двух сыноў Стэфана і Вацлава. Жонка Зіна засталася ў Ласавічах, а потым выйшла замуж другі раз за Сюляймана Мустафавіча Гямбіцкага ў Дзясятнікі (Багданава). Яна добра чытала і прыгожа спявала малітвы, выконвала рэлігійныя справы на мізарах.

Брат Іосіфа Бякір Паўтаржыцкі таксама выехаў ў Польшчу да вайны, дзе і застаўся. Меў жонку польку і дзяцей Галіну, Бранiслава і Яна.

Аляксандр Паўтаржыцкі (1904 - 1969) жыў у Ашмянах на вуліцы Горнай побач з Хасяневічамі, Рызвановічамі і Гямбіцкімі, пахаваны ў Олькавічах. Меў жонку Аўгіню Мустафаўну Якубоўскую з Ашмянаў і дзяцей Ніну, Эмілію, Зою і Аляксандра.

Якуб (1926 - 2003) быў ветэранам Другой усясветнай вайны, пайшоў на фронт у 1944 годзе, меў узнагароды. Жыў у Лідзе, меў адну жонку Мяр'ему Іванаўну Карыцкую (1932 - 1991) з Наваградка і дзяцей Рамана і Яна і другую жонку Эмілію Якубаўну Радкевіч (1927 - 2020) з Ільянова і сына Барыса. Пахаваны Якуб на мізары ў Лоўчыцах, а Эмілія – ў Іўі.

Ніяра выйшла замуж за Якуба Лебедзя[74] ў Рымцелі, а пасля ягонай смерці – за Якуба Аляксандравіча Александровіча ў Зафінова.

[74] гл. Дзяракі і Рымцелі.

Што да бацькоў Мустафы Паўтаржыцкага, то імі былі вышэйзгаданы калегіяльны асэсар Алей Іванавіч Паўтаржыцкі і Шарыфа (Серафіма) Іосіфаўна, якія таксама пахаваныя на мізары ў Даўбуцішках. Акрамя Мустафы і Розы[75] яны мелі дзяцей Яна, Іосіфа, Эльміру і Магамета. У 1853 годзе Алей з дзецьмі быў зацверджаны ў шляхецтве. Алей займаў пасады ў кіраўніцтве Віленскай губерні. Так, у 1864 служыў сакратаром і пісарам у Маладзечне. Паходзіў з Наваградка, куды ягоныя продкі перасяліліся з маёнтка на рацэ Вака пад Вільняй. Прапрадзед Алея Мустафа стаў першым Паўтаржыцкім, бо да гэтага продкі мелі прозвішча Пултар.

Сын Алея Іосіф (1881 г.н.) быў паручнікам з 1911 года, служыў з 1916 штабс-капітанам у 271-ым пяхотным Краснасельскім полку, кіраваў ротай з 1915. Падчас Першай усясветнай быў узнагароджаны ордэнамі Св. Георга 4 ст., Св. Ганны 4 і 3 ст., Св. Станіслава 4, 3 і 2 ст[76], Георгіеўскай зброяй. Быў паранены ў снежні 1914. Атрымаў ад бацькі шмат зямлі ў Ласавічах і Даўбуцішках, частку якой потым прадаў швагру Сюляйману Шабановічу. Іосіф быў арыштаваны 17 жніўня 1940[77] у Ашмянах, дзе працаваў загадчыкам гаспадаркі ў школе. Асуджаны на 8 гадоў і высланы ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы.

Дачка Алея Эльміра (10.03.1884 – 23.08.1959) выйшла замуж за вайскоўца з Яшунаў Мустафу Асановіча. Мела дзяцей Сафію Смайкевіч[78], паручніка Бякіра і інжынера-геадэзіста Якуба. Пасля вайны выехалі ў Ольштын. Бякір у 1939 служыў у 4-ым Сувальскім дывізіёне кавалерыі і трапіў у палон да немцаў. Пасля вайны вярнуўся ў Польшчу і працаваў у Міністэрстве транспарту. Эльміра і Бякір пахаваныя на мізары ў Варшаве.

Сын Алея Магамет вучыўся ў Яраслаўскай ваеннай школе, з 11.11.1898 працаваў у паліцыі м. Свянцяны, а на пачатку XX ст. – у паліцыі г. Вільня. Меў жонку Тамару і 3 дзяцей.

***Цярэшкі***

На 1887 год у Цярэшках сярод вернікаў, што прымалі ўдзел у абранні імама Смайкевіча, згадваюцца паручнік Аляксандр Іванавіч Базарэвіч і Ян Якубоўскі.

А. Базарэвіч нарадзіўся ў 1818 годзе ў сям'і землеўласніка ў Уланаўшчыне і Войцерах Яна Базарэвіча і Айшы з Сулькевічаў з Паніззя. Меў брата Якуба ў вёсцы Арда Клецкага раёна. Ажаніўся з Мяр'емай Скірмунт і меў дачок Сафію Сюнякевіч і Алену Крычынскую ў маёнтку Лайлубка пад Ашмянамі (муж суддзя Алей Крычынскі).

Сярод жыхароў Цярэшак былі прадстаўнікі роду Лебедзь, сваякі тым, што жылі ў Дзяраках і Рымцелях. Так, у 1811 годзе сюды пераехаў былы Наваградскі імам Самуіл Іосіфавіч Лебедзь з сям'ёй. У 1819 набыў у Якуба

---

[75] Шабановіч, гл. Даўбуцішкі.
[76] https://gwar.mil.ru/heroes/
[77] http://lists.memo.ru/
[78] Нявестка імама Мустафы Смайкевіча.

Крычынскага землі. Лебедзі згадваюцца і сярод дакументаў сярэдзіны XIX ст, а некаторыя пераехалі ў ЗША.

У Цярэшках у першай палове XX ст. жылі Гямбіцкія – Хасень Якубавіч (1880 - 1942) і Халіма Якубаўна з Радкевічаў (1895 - ?) з дзецьмі Браніславам, Якубам (1908 - 1987)[79], Іосіфам, Аляксандрам і Гэленай. Нашчадкі перасяліліся ў Смаргонь, Даўбуцішкі, Ліду, Іўе і інш. Гэлена выйшла замуж за Якуба Мустафавіча Радкевіча ў Даўбуцішкі[80].

***Сінькі (Капланы)***

У Капланах жыла сям’я Варановічаў – Міхаіл Ібрагімавіч (1880 - 1939) і Эмілія Аляксандраўна (1890 - 1941) з Мухарскіх з Крынак Крушынянскай парафіі. Мелі дзяцей Аляксандра (1918 - 2003), Сюляймана, Мустафу (1922 - 1961), Гэлену (1931 - 1994) і Аўгіню (1945 - 2008). Падчас Першай усясветнай вайны былі ў эвакуацыі ў Аранбургу. Там жа ў 1918 нарадзіўся сын Аляксандр: захавалася метрыка, выдадзеная яму ў мясцовай мячэці. Пасля 1922 года вярнуліся на радзіму, жылі ў Капланах, дзе нарадзілся астатнія дзеці.

Сюляйман Варановіч жыў у Гальшанах.

Мустафа (Стэфан, Сцяпан) Варановіч (1922 - 1961) жыў у Гораўшчыне (каля Палянаў), меў жонку Сафію Якубаўну Якубоўскую з Куранца, карані якой былі з Даўбуцішак. Пахаваныя ў Даўбуцішках на мізары. Іхныя дзеці – Тамара Шабановіч у м. Багданава, Зіна Чымбаевіч у в. Вытрапаўшчына (Маладзечна) і адвакат Раман, які сям’і не меў, памяняў імя на Сцяпан і пасля смерці быў пахаваны на мізары ў Даўбуцішках.

Гэлена Варановіч (1931 - 1994) выйшла замуж за Сюляймана Самуілавіча Шабановіча (1933 - 1971)[81] з Палянаў, мела сына Аляксандра (1957 - 2003). Усе пахаваныя ў Даўбуцішках на мізары.

---

[79] гл. Ашмяны.

[80] гл. Даўбуцішкі.

[81] Загінуў падчас аварыі на матацыкле.



Міхал Ібрагімавіч Варановіч з сям’ёй

Аўгіня Варановіч (1945 - 2008) выйшла замуж за Мустафу Аляксандравіча Асановіча з Відзаў, жылі ў Смаргоні. Дзеці – Тамара, Ліда і Эмір.

Сярод 5 дзяцей Міхала Варановіча толькі Аляксандр (1918 - 2003) застаўся ў Капланах. Жыў на вуліцы Цэнтральнай. Адразу хата стаяла на пагорку, затым пабудавалі новую, бліжэй да вуліцы. Меў жонку Жанну Бякіраўну Радкевіч[82] (1926 - 2008) з Гальшанаў і дзяцей Галіну Шабановіч у Іўі, Сафію Радзецкую ў Іўі, Тамару Шабановіч і Адама. На сённяшні дзень у доме жыве Тамара Шабановіч. Адам загінуў падчас дарожнай аварыі і пахаваны на мізары ў Даўбуцішках. Сын Сафіі Радзецкай – Адам Сюляйманавіч Радзецкі – займае пасаду імама ў Іўі.

У доме насупраць, праз вуліцу, жыла сям’я Ільясевічаў. Самуіл Хасенявіч Ільясевіч меў жонку Галіну і 5 дзяцей – Іосіфа, Мустафу, Алея, Азыму і Аўгіню. Самуіл і Галіна пахаваныя на мізары ў Даўбуцішках, але на помніках няма надпісаў.

[82] Дачка годжага з Іўя.

Сын Іосіф (1926 - 2012) удзельнічаў у будаўніцтве чыгункі да станцыі Залессе. Меў жонку Еву Бякіраўну з Радкевічаў[83] (1926 - 2017) з Гальшанаў, і дзяцей Іосіфа (старшыню калгаса) і Галіну. На сённяшні дзень тут жыве дачка Галіна. Старшыня Іосіф Іосіфавіч[84] ажаніўся з Аміняй Якубаўнай Радлінскай з Іўя, меў 2 сыноў. Аміня зараз жыве ў Сіньках.

Азыма жыла ў Дзясятніках, мела мужа муэдзіна Давыда Халілявіча Шабановіча і дзяцей Рамана ў Ашмянах[85] і Самуіла.

Аўгіня выйшла замуж за Бранислава Якубавіча Гямбіцкага (1913 - 1999) ў Дзясятнікі, дзеці – Тамара ў Маладзечне і Галіна ў Карэлічах.

У Сіньках таксама жыве Раман Аляксандравіч Радкевіч з Даўбуцішак, унук муэдзіна. Даглядае бацькаву хату ў Даўбуцішках.

### *Дзяракі і Рымцелі*

Землі ў Дзераках і Рымцелях ўваходзілі ў склад маёнтка Даўбуцішкі, што належаў Крычынскім. Акрамя таго, тут жылі сем'і Лебедзяў і Рафаловічаў, што прыехалі сюды з Іўя і Навагрудка.

Лебедзь Амурат Якубавіч (нар. у лютым 1807[86]), сын імама, быў штабс-капітанам у расейскім войску. Ад жонкі Шарыфы (Серафімы) Іванаўны Яблонскай меў дзяцей Халіму Лебедзь-Чымбаевіч, Шарыфу Карыцкую і Амурата. Амурат Якубавіч з Шарыфай пахаваныя на мізары ў Даўбуцішках. На ягоным помніку няма даты смерці. Шарыфа пахаваная як Серафіма, і яна жыла 69 гадоў.

Сын Амурата Амурат (28.04.1859[87]) меў у Дзяраках каля 80 дзесяцінаў зямлі на пачатку XX ст. Падчас выбараў Даўбуцішскага імама Рафаловіча пісаў лісты ў павятовыя органы ўлады з патрабаваннем скасавання вынікаў. Меў дзяцей Люта (Алея) (1884 г.н.) і Сафію Радкевіч (1891 - 1952).

Лют ажаніўся ў 1918 годзе ў Іўі з Аніфай Мустафаўнай Шабановіч (1888 г.н.)[88], меў дзяцей Ібрагіма ў Маладзечне (ж. Сафія Адамаўна Радкевіч з Даўбуцішак, дзеці Ірына, Аляксандр, Міхаіл і Барыс), Мустафу ў Маскве (дзеці Раіса, Ганна, Нэла і Аляксандр), Амурата (дзяцей не было) ў Крулеўшчыне[89] і Зарэму, што была двойчы замужам – за Гямбіцкім (дачка Мяр'ема Радкевіч і нашчадкі ў Іўі і Навагрудку) і за Якубам Амуратавічам Сафарэвічам (1928 - 2000) з Іўя (дзеці Ганна Якубовіч (Якубоўская) ў в. Сорак татар і Амурат (1958 - 1980) у Іўі, які загінуў падчас аўтааварыі).

Сястра Люта Сафія (1891 - 1952) была замужам за Алеем Амуратавічам Радкевічам (1901 - 1971) з Даўбуцішак. Мелі дачку Зінаіду, якая засталася апошняй уладальніцай гаспадаркі ў Дзяраках. Пасля смерці Сафіі[90] Алей ажаніўся са сваёй стрыечнай сястрой па маці Лімай Амуратаўнай Смольскай і

[83] Дачка годжага з Іўя.
[84] Памёр і пахаваны ў Даўбуцішках у 2019 годзе.
[85] гл. Ашмяны.
[86] метрыка у кітабе.
[87] метрыка нараджэння ў кітабе. І. Канапацкі, А. Смолік. Гісторыя і культура беларускіх татар, 2005
[88] метрыка мячэці ў Іўі.
[89] Докшыцкі раён.
[90] Пахаваная ў Даўбуцішках.

жыў з ёю ў Глыбокім, дзе і памёр[91]. Зінаіда выйшла першы раз за Самуіла Рафаловіча, сына апошняга Даўбуцішскага імама “Маршалка”. Мае сына Аляксандра (1948) ў Маладзечне. Пасля таго, як Самуіл загінуў падчас службы ў арміі, Зінаіда выйшла замуж другі раз і нарадзіла дачку Эльвіру, што жыве ў Смаргоні.

Брат Амурата Якубавіча Лебедзя Самуіл (1796 - ?) стаў палкоўнікам, меў 89 дзесяцінаў зямлі ў Дзераках. Меў жонку Сафію Паўтаржыцкую (маці з Яблонскіх) і дачку Гэлену Байрашэўскую (? - 1930). Муж Гэлены Ян Самуілавіч Байрашэўскі (1868 - 1925) паходзіў са Слоніма, служыў на чыгунцы, пахаваны ў Даўбуцішках. Дзеці Гэлены і Яна Байрашэўскіх – Самуіл (1916 - 1992), Асман (1918 - 1999), Тамерлан (1921 - ?) і Ян (1925 - 1944) засталіся сіротамі, і іх гадавалі сваякі Талькоўскія ў Слоніме[92]. Асман ажаніўся ў 1941 з полькай, у 1944 выехаў у Варшаву, а з 1947 жыў ува Ўроцлаве. Меў дачку Гэлену (1942 - 2013), якая заставалася ў Слоніме да 1952, пакуль не выехала ўва Ўроцлаў. Самуіл Байрашэўскі быў арыштаваны пасля 1939 і высланы. Трапіў у армію Андэрса і пасля Другой усясветнай вайны жыў у Англіі, а потым эміграваў у Аўстралію. Тамерлан падчас вайны змагаўся ў шэгарах арміі краёвай, пасля вайны быў арыштаваны, і ягоны лёс невядомы. Ян быў вывезены на прымусовую працу ў Нямеччыну і загінуў падчас абстрэлу.

Брат Амурата Якубавіча Лебедзя Ібрагім (1794[93] - 1854) таксама жыў у Дзяраках, пахаваны на мізары ў Даўбуцішках. Меў жонку Айшу Чымбаевіч і дзяцей Сафію Александровіч, Гэлену, Розу, Яна і Іосіфа. Іосіф займаў пасаду суддзі ў Баранавічах, а ягоны сын Амурат (1892 г.н.) быў ветэранам Першай усясветнай вайны і паранены ў 1914[94].

Сястра Амурата Мяр’ема (1799 - 1870[95]) была замужам за ротмістрам Шчуцкім у Дзяраках. Мела яшчэ брата Яна, які памёр у дзяцінстве (1804 - 1813).

Сваякі вышэйзгаданых Лебедзяў, што жылі ў Цярэшках, мелі нашчадкаў у Дзяраках і Рымцелях[96]. Так, Лебедзь Самуіл Хасенявіч, унук палкоўніка Саліха, меў у Рымцелях каля 60 дзесяцінаў зямлі і шмат лесу. Ажаніўся з Мяр’емай Ільясевіч, меў дзяцей Якуба, Хасеня, Халіму і Сюзанну. Халіма выйшла за Ібрагіма Лебедзя з Цярэшак, а Сюзанна выехала ў Польшчу.

Сын Якуб (1908 - 1945) меў жонку Ніяру Паўтаржыцкую (1918 - 1994) з Ласавічаў і дачку Эмілію. Падчас Другой усясветнай вайны Якуб у лютым 1945 года атрымаў медаль “За отвагу”, але загінуў на фронце ў сакавіку[97]. У іхным доме пасля вайны была школа. Ніяра выйшла другі раз замуж за Якуба Аляксандравіча Александровіча ў м. Вішнева. Пахаваныя на мізары на Ластаі.

[91] Пахаваны ў Амбросавічах.
[92] K. Olechnowicz. Dolnośląscy Tatarzy. Rocznik Tatarów Polskich, T. VII, 2020
[93] Метрыка нараджэння ў кітабе.
[94] https://gwar.mil.ru/
[95] Метрыкі ў кітабе.
[96] S. Dumin. Herbarz rodzin tatarskich WKL
[97] https://pamyat-naroda.ru/

Хасень ад жонкі волькі Рузі меў дзяцеў Марыю, Гэлену, Таміру, Асмана. Падчас вайны працаваў на партызанаў і выконваў абавязкі солтыса ў Рымцелях, а пасля вайны быў арыштаваны, моцна скалечаны. Дзеці выехалі ў Маладзечна, Гальшаны, Літву.

Дзеракі на сённяшні дзень паступова знікаюць. Засталіся 3 нежылыя гаспадаркі, з якіх адзін дом належыць Зіне Аляксандраўне Рафаловіч (Радкевіч). У Рымцелях каля 20 гаспадарак, не татарскіх.

Пра былую населенасць Дзеракаў могуць сведчыць 2 мізары, што знаходзіліся тут яшчэ да сярэдзіны XX ст, але былі знішчаныя ў пасляваенны час.

***Ластая***

Паселішча Ластая складалася з некалькіх асобных гаспадарак, у тым ліку маёнткаў. Адной з іх была гаспадарка муэдзіна Леона Александровіча. Знаходзілася на левым беразе ракі Ластаянка, і ў другой палове дома было малітоўнае памяшканне. Пра сям'ю муэдзіна гл. вышэй.



Баль на Ластаі

На поўнач ад муэдзіна быў маёнтак Сулькевічаў. У пасляваенны час будынак выкарыстоўваўся як школа. Былыя вучні згадвалі, што падлога мела тоўсты дубовы паркет. Ад маёнтка захаваліся толькі падмуркі, руіны хрысціянскай капліцы і старыя ліпы вакол сядзібы.

На правым беразе Ластаянкі стаялі маёнткі Крычынскіх і Талькоўскіх.

Талькоўскі Раман, паручнік, меў маёнтак на Ластаі і землі ў Кутах. Меў жонку Мяр'ему Іосіфаўну Крычынскую і дзяцей Алену Ільясевіч[98], Рамазана, Барыса, Віктара (Вітольда) і Джантэміра.

[98] Муж – маёр Аляксандр Ільясевіч, полк уланаў

Рамазан (1903 – 1940) у 1938 годзе пісаў пра Ластаю ў татарскім часопісе міжваенай Польшчы. Ажаніўся ў тым жа годзе ў Вільні з полькай Марыяй Малахоўскай[99]. У 1939 годзе арыштаваны і расстраляны ў Катыні.

Вітольд (1907) у 1937 ажаніўся з Крычынскай[100], меў сына Сяліма (1939). Пасля вайны жылі ўва Ўроцлаве

З Талькоўскіх з Ластаі паходзіла і жонка першага муфтэя Якуба Шынкевіча – Ліда. Яна нарадзілася ў 1910 годзе ў сям'і Яна Сялімавіча Талькоўскага і Эвы Магаметаўны з Макуловічаў. Пахаваная з мужам у ЗША, куды пераехалі ў 1952 годзе пасля працяглага перыяду жыцця ў Егіпце. Сын Ліды і муфтэя – Джаміль – памёр у 2020 годзе ў ЗША.

На Ластаі ў пасляваенны час былі яшчэ 2 гаспадаркі каталікоў. Знаходзіліся каля маёнтка Сулькевіча.

***Леанполь***

Фальварак Леанполь знаходзіцца паміж Рымцелямі і Крэвам. Тут жылі 2 сям'і Шчансновічаў - двух братоў – Мустафы і Бякіра, сыноў Якуба.

Мустафа меў дзяцей Сюляймана (1893 - 1961), Яна (1908 - 1982), Якуба (1890 - 1941) у Немежы і Розу Якубоўскую (1911 - 1993) ў Радашковічах[101].

Ян першы раз ажаніўся з Лімай Адамаўнай Гямбіцкай, жыў з ёю ў ф. Гонтаўшчына каля Гальшанаў, меў дзяцей Алея, Сюляймана, Мустафу, Галіну (1937 - 2019)[102], а ад другой жонкі Гэлены Самуілаўны Мількамановіч – сына Яна. Ян і Ліма пахаваныя на Ластаі, а Гэлена – у Іўі. Дзеці перасяліліся ў Ашмяны і Гальшаны, некаторыя выехалі з Беларусі.

Сюляйман меў жонку з Іўя – Фаціму Самуілаўну Шчуцкую (1896 - ?). Сястра Фацімы, Аніфа Рафаловіч-Шабановіч (1886 - ?), жыла пэўны час ў ЗША, адкуль пасля смерці першага мужа Сюляймана Іванавіча Рафаловіча (1884 - 1914) вярнулася з трыма дочкамі. Адна з гэтых дачок, Мяр'ема, згадвалася вышэй у Даўбуцішках як жонка Ях'і Давыдавіча Радкевіча, брата муэдзіна. Сюляйман і Фаціма Шчансновічы мелі сына Мустафу (1922[103] - ?), які першым шлюбам пабраўся з Аміняй Іосіфаўнай Міскевіч з Іўя, меў сына Якуба. Мустафа потым жыў у Радашковічах, меў другую сям'ю і пахаваны на могілках у в. Дуброва.

Бякір (1870 - ?) таксама меў жонку з Іўя – Фаціму Самуілаўну Шабановіч (1874 - ?)[104]. Іхны сын Мустафа быў ветэранам, пахаваны ў Даўбуцішках. Жонка - Зіна Адамаўна Мейшутовіч (1898 - 1959) з м. Крывічы, а дзеці – Адам і Бякір (1929 - 1996), што пераехалі ў Маладзечна. Жонка Адама – Фарыда Самуілаўна Паўтаржыцкая (1938 - 2009) з в. Абруб, што каля Глыбокага.

Сюляйман Шчансновіч пераехаў у Польшчу.

---

[99] Метрыка Віленскай мячэці
[100] Метрыка шлюбу ў мячэці в. Сорак татар.
[101] гл. Радашковічы.
[102] Жыла ў Ашмянах, памерла ў 2019 і пахаваная на мізары ў Ольkaвічах.
[103] Метрыка нараджэння Іўе.
[104] Метрыка шлюбу 1894 г. у Іўі.

Алей Шчансновіч (1914 – 1981) ажаніўся з Халімай Якубаўнай Гямбіцкай (1909 - 1987) з Глыбокага, іхныя дзеці – Хасень (1936), Сафія і Франя. Хасень жыве ў Глыбокім з сынам. Алей пахаваны ў Даўбуцішках, а Халіма – ў Амросавічах.

Хадыджа (1911 – 2001) выйшла замуж у в. Сорак татар за Алея Мустафавіча Мількамановіча (1904 - 1943). Дзеці – Стэфан, Роза і Эмір. Алей забіты падчас вайны невядомымі[105].

Мяр’ема (1907 - ?) выйшла замуж у Іўе за Халіля Адамавіча Рафаловіча, іх дзеці - Адам, Фаціма і Аміня.

Іхная сваячка Аміня Шчансновіч таксама жыла ў Сорак татар, выйшла за Яна Паўтаракевіча, сына імама. Ейныя нашчадкі – ў Літве, Ашмянах, Іўі.

У пасляваенны час усе татары з Леанполя выехалі ў Глыбокае, Ашмяны, Маладзечна і г.д. Захаваўся адзін нежылы дом.

***Гальшаны***

Пісьмовыя згадкі пра татараў у м. Гальшаны датуюцца 1795 годам у перапісе жыхароў мястэчка. Тут знаходзілася 5 татарскіх гаспадарак, у якіх жыло 9 сем’яў (29 чалавек).

Першай гаспадаркай валодала ўдава Маруна Чабанава Н. (76 гадоў) з сынам удаўцом Багданам (40) і ўнукамі Мустафой (20) і Мяр’емай (1).

На другой гаспадарцы жыла ўдава Ева Самуілава Гямбіцкая (56) з сынамі Юсуфам (16) і Якубам (6). Пры іх жылі кутнікі Абрагам сын Хасеня Н. (35) з жонкай Розай (27) і сынам Юсуфам (9).

Трэцяя гаспадарка належала Мухараму Самуілавічу Гямбіцкаму (40). Жонка – Фаціма (34), дзеці – Самуіл (9), Мяр’ема (15), Роза (12), Айша (7). Пры ім жыў таксама брат Алюнь (31) з жонкай Евай (27) і сынам Ібрагімам (10).

Наступная гаспадарка – ўдавы Айшы Сапаравай Н. (50). Дзеці – Мухарам (20) і Хадзя (18). З імі жыла ўдава Маруна Гямбіцкая (35) з сынам Ібрагімам (10).

Апошняя гаспадарка належала Мустафе Сапаравічу Якубоўскаму (25) з жонкай Мяр’емай (20). З імі жыла сям’я Мураўскіх – Самуіл (56), жонка Гэлена (30) і дачка Сафія (11).

Пасямейныя спісы 1834 года татараў Гямбіцкіх Ашмянскага павету са справы аб шляхецтве роду даюць звесткі, што ў Гальшанах у гэты час ува ўласным доме жыла сям’я Іосіфа Багданавіча Гямбіцкага (30 гадоў). Ягоная жонка Роза з Абрамовічаў (28) і сын Ібрагім (8).

У 1887 годзе падчас выбараў імама Даўбуцішак сярод вернікаў гэтай мячэці пазначаныя 7 татараў-гаспадароў з Гальшанаў. Гэта Гямбіцкія Мустафа, Хусаін і Алей, Сюляйман Шчуцкі, Мустафа Рызвановіч, Хасень Асановіч і Амурат Якубоўскі.

Мустафа Гямбіцкі меў у Гальшанах гарбарню, а таксама каля 20 дзесяцінаў зямлі[106]. Ад жонкі Евы Якубаўны меў 5 дзяцей – Гэлену Ільясевіч (1865 - 1954),

[105] У тую ноч расстралялі 5 чалавек з в. Сорак татар. Хто і за што – невядома.

Мяр'ему ў Беліцы, Адама (? - 1956), Якуба ў Дзясятніках і вышэйзгаданага Аляксандра (1852 - 1932), які так і не стаў імамам у Даўбуцішках.

Адам з жонкай Галімай і дочкамі Сафіяй Радкевіч-Міскевіч і Лімай Шчансновіч жыў на хутары Гонтаўшчына каля Гальшанаў. Меў млын на рацэ, праз які судзіўся за затопленыя землі. Меў 2 жонак – Галіму (пахаваная ў Мінску падчас эвакуацыі) і Айшу, з якой пахаваныя на Ластаі.



х. Гонтаўшчына. Фота А. Лаўрыновіча. 1976 год.

Гэлена з мужам Хасенем Аляксандравічам Ільясевічам (1871 - 1938) у міжваенны час пабудавалі дом у Гальшанах па вул. Ашмянскай. Мелі дзяцей Мустафу ў Іўі і Самародніках, Аляксандра ў Вільні, Хасеня, Аміню і Сафію. Апошняя і засталася жыць у доме бацькоў у Гальшанах, выйшла замуж за Якуба Самуілавіча Александровіча (1907 - 1985) з м. Дунілавічы, што каля Мядзела. Дзеці Сафіі і Якуба – Аляксандр (памёр у 2020, працаваў у міліцыі), Самуіл, Зінаіда (1941 - 2019) і Тамара (1958 – 2003, муж Алей Ібрагімавіч Шабановіч, дзеці Ібрагім і Аміня) у Іўі.

Яшчэ адной сям'ёй у Гальшанах (вёска Слабада) была сям'я Рызвановічаў, прадстаўнікі якой жывуць там і зараз. Так, Адам Рызвановіч меў дачку Гэлену Мураўскую-Канапацкую і сына Мустафу. Мустафа ад жонкі Гэлены Самуілаўны Мількамановіч нарадзіў дзяцей Хасеня, Сафію, Мяр'ему і Джамілю. Мяр'ема з мужам Мустафой Мухля жыла ў Путрышках каля Гродна, мела дачок Тамару, Гэлену і сына Аляксандра Мухлю, які загінуў у Афганістане і пахаваны на мізары ў Іўі.

Варановіч Сюляйман Міхайлавіч перасяліўся ў Гальшаны з-пад Даўбуцішак. Меў жонку Тамару Леонаўну Гямбіцкую з Дзясятнікаў і дзяцей Аўгіню (1951, Украіна), Аляксандра (ст. Ашмяны) і Лілю (Англія). Утануў і

[106] Т. Байрашаускайте. Татарское землевладение в Виленской губернии во второй половине XIX – начале XX века. Сборник материалов международной конференции, посвящённой 615-летней годовщине поселения татар и караимов в ВКЛ. 29 – 31 мая 2013.

быў пахаваны на гарадскіх могілках у Гальшанах. Жонка выйшла другі раз замуж, і пасля смерці яе пахавалі каля першага мужа ў Гальшанах.

На сённяшні дзень у Гальшанах татараў не засталося.

***Крэва***

Перапіс 1795 года паказвае, што ў Крэве жылі наступныя татарскія сем'і:

1. Асановіч Ян Рафалавіч (70), жонка Фаціма (57), сын Мустафа (1780 - 1801), сын Давыд (30), жонка Давыда Гэлена (20).
2. Мураўскі Мустафа Міхайлавіч (35), жонка Роза (30), сын Алей (5), сын Міхал (3), дачка Сафія (1) і маці Мустафы – Мяр'ема (80).
3. Мейшутовіч Давыд Іосіфавіч (18), брат Мустафа (23), жонка Мустафы Сафія (18), брат Адам (20), брат Алей (10). Прадзед гэтых братоў Рафал Мейшутовіч на пачатку XVIII ст. валодаў землямі на Ластаі, якія перадаў свайму сыну Ібрагіму, а той у сваю чаргу сыну Іосіфу. Іосіф прадаў Ластаю ў 1780 годзе, і ягоныя дзеці пасяляліся ў м. Крэва і ў Мінску. З братамі ў адным доме жылі Сымон Якубоўскі (28) з жонкай Фацімай (30) і дочкамі Шарыфай (1) і Аніфай (1).
4. Базарэвіч Іосіф Аляксандравіч (35) з жонкай Фацімай (26) і дочкамі Мяр'емай (5) і Розай (2).
5. Базарэвіч Якуб Аляксандравіч (1747 - 1805) з жонкай Сафіяй (38), дзецьмі Алеем (1779 - 1807), Сымонам (13), Мустафой (8), Розай (20) і Мяр'емай (5).

У 1803 годзе да Мустафы Мураўскага прыехаў з Іўя брат Іосіф, у якога ў 1807 нарадзіўся сын Мустафа. Што да Мустафы Міхайлавіча, то ён яшчэ згадваецца ў 1811 годзе ў Крэве. Магчыма, ён памёр да 1816 года, бо тады жонка з дзецьмі жыла ў м. Лебедзева каля Маладзечна. А ў 1822 годзе дзеці ўжо жылі ў в. Мароські на землях Радзішэўскіх. Іхныя далейшыя сваякі Мураўскія ў гэты час жылі ў Палянах.

Вышэйзгаданы Адам Мейшутовіч з Крэва ў 1804 годзе перасяліўся ў Смаргонь, затым у 1822 годзе набыў фальварак Няверы на Вілейшчыне. Ягоныя нашчадкі жылі потым у Дунілавічах, Алешыне, Глыбокім і г.д.

У Мейшутовічаў быў яшчэ пяты брат Ібрагім (нар. 10.05.1796), які прыехаў у Крэва з Мінска ў 1810 годзе. Першы час кватараваў у Мураўскага Іосіфа, затым набыў зямлю ў в. Сялец, што недалёка ад Крэва.

У 1811 годзе ў Асановічаў Давыда і Гэлены згадваецца ў Крэве сын Мустафа (1803 г.н.).

Сымон і Мустафа Базарэвічы у 1803 годзе з Крэва выехалі.

У 1834 годзе, паводле пасямейнага спісу, у Крэве жыла сям'я Гямбіцкага Ібрагіма Аляксандравіча (50). Гэта сам гаспадар з жонкай Гэленай з Радкевічаў (30) і дачкой Халімай (9), ягоны брат Мустафа (45) з жонкай Розай з Мураўскіх (30) і дзецьмі Алеем (12), Амуратам (2), Мяр'емай, Халімай і Аміняй.

У 1887 годзе у м. Крэва згадваюцца Амурат і Хасень Якубоўскія, а таксама Амурат Гямбіцкі, што прымалі ўдзел у выбарах імама Даўбуцішак.

Гямбіцкі Амурат Аляксандравіч (1865 - 1938) меў першую жонку, пасля смерці якой ажаніўся ў 1898 годзе з Шарыфай Захараўнай з Сафарэвічаў з Іўя. Меў 3 дзяцей – Розу, Мустафу і Аляксандра. Некалькі разоў быў у ЗША ў сваяка Халіля Радлінскага, дзе і застаўся ў горадзе Вудрыдж з дачкой і сынам Мустафой. У мусульманскую арганізацыю не ўваходзіў, але быў пахаваны на парафіяльным мізары ў Нью-Ёрку. Сын Мустафа быў у арганізацыі, але некалькі разоў выключаўся з яе па прычыне нерэгулярнай аплаты складак. Сын Аляксандр застаўся ў Крэве, а ў 1935 ажаніўся ў Іўі з удавой Мяр’емай Саліхаўнай Шабановіч (“Сюджма”, з Багдановічаў), якая затым выехала ў ЗША. Дачка Роза выехала ў ЗША ў 1905 з Розай Шабановіч і Сафіяй Варановіч, выйшла замуж у 1908 годзе за Давыда Якубавіча Радлінскага з Іўя, мела дзяцей Аніфу Аліевіч і Аляксандра.



Сям’я Самуіла Мейшутовіча з Крэва

Якубоўскі Хасень Ібрагімавіч (1817 г.н.), прадстаўнік шостага пакалення Якубоўскіх, перасяліўся ў Крэва з-пад Свянцян. Меў жонку Сафію з Якубоўскіх, 3 дачок – Танзілю, Айшу і Азыму і 4 сыноў – Амурата, Якуба, Халіля і Ісмаіла.

Сын Амурат (1842 - 1908) меў жонку Мяр’ему Ібрагімаўну Базарэвіч (1846 - 1900) з Мядзела і дзяцей Хасеня, Іосіфа, Якуба, Аляксандра, Азыму і Айшу[107]. Дзеці Хасеня – Якуб (знік падчас вайны, жонка Схоля Паўтаржыцкая і

[107] Радавод дадзенай галіны Якубоўскіх быў складзены Аляксандрам Якубавічам Якубоўскім са Свянцянаў

нашчадкі ў Немежы), Мяр’ема Ільясевіч (1901 - 1959), Іосіф (1906 - 1973) і Азыма Гямбіцкая (1912 – 1985) у Ашмянах. Іосіф (1878 - 1933) жыў у Вільні, пахаваны на Ліпаўцы, меў жонку немку і 4 дзяцей, якія ў 1939 выехалі ў Польшчу. Якуб (1882 - 1954) меў жонку Азыму Іосіфаўну Базарэвіч з м. Зарубін і дзяцей Амурата ў Ашмянах, Мяр’ему Радлінскую ў Ашмянах, Мацея ў Ашмянах і Аляксандра ў Свянцянах. З 1924 года Якуб валодаў гарбарняй у Крэве[108]. Аляксандр, сын Амурата, меў жонку Айшу з Шабановічаў з Іўя і дзяцей Мяр’ему Шабановіч (1903 - 1982) у Палянах, Амурата (1909 - 1993) ў Ашмянах, Мустафу (1911 - 2005), Азыму Рафаловіч (1915 - 1971) ў Наваградку, Фаціму Паўтаржыцкую (1920 - 1946) і Якуба (1922 - 2004).



Якубоўскія з Крэва
Сядзяць: Азыма з Базарэвічаў, Якуб Якубоўскі, Танзіля з Лебедзяў.
Стаяць: Аніфа з Шабановічаў, Якуб Якубоўскі, Заіра, Олюсь Якубоўскі, Ніяра з Шабановічаў, Мустафа Якубоўскі, Сафія Вішнеўская (пляменніца Азымы).

Дом Якуба Аляксандравіча Якубоўскага (1922 - 2004) захаваўся і належыць нашчадкам. Ён меў жонку Аніфу Іосіфаўну Шабановіч (1926 - 2001) з Дэлятычаў, бацька якой пэўны час жыў у ЗША, але вярнуўся і пахаваны ў Іўі. Дзеці Якуба і Аніфы – Лейла (1947 - 2016), Таіра, Аляксандр, Іосіф і Джаміля ў Маскве.

108 Акт агляду гарбарні за 1928 год. Ашмяны.

Мустафа Якубоўскі (1911 - 2005) ажаніўся з Танзіляй Мустафаўнай Лебедзь з Наваградка, меў дзяцей Галіну Багдановіч у Наваградку, Аляксандра ў Залессі, Зінаіду ў Смаргоні і Заіру.



Татары з Крэва, Ашмянаў, Кярвеляў і інш.

Амурат (1909 - 1993) ажаніўся з Сафіяй Іванаўнай Шэгідэвіч з Наваградка, меў дзяцей Лілію Шабановіч, Іосіфа, Аляксандра, Тамару Александровіч у Літве і Дзіну Александровіч у Літве. У 1950-ыя гады сям'я перасялілася з Крэва ў Ашмяны на Гальшанскую вуліцу.

Якуб і Ісмаіл, сыны Хасеня, перасяліся ў Мінск. Сын Ісмаіла, Мустафа, меў жонку Айшу з Лебедзь і 10 дзяцей. Пэўны час жыў з сям'ёй у Кярвелях, што недалёка ад Іўя, а потым у Немежы, дзе і пахаваныя. Сын Мустафы Адам быў старшынёй парафіі ў Немежы.

Пасля вайны ў Крэве недалёка ад замка жыла сям'я муэдзіна Бякіра Мусіча з Ластаі і Александровічы з Раўка. Дом Мусіча зараз належыць дачцэ Ліліі.

***Вішнева і Зафінова***

Першымі татарамі у м. Вішнева згадваюцца Ждановічы. Так, Давыд Рафалавіч Ждановіч 1745 г.н. валодаў надзелам у ваколіцах Зафінова і Вішнева. Меў сына Сюляймана, унукаў Мустафу, Якуба, Іосіфа, Давыда, Хасеня, Эльяша, праўнука Сюляймана Давыдавіча. Пазней прадстаўнікі роду жылі ў Бакштах і трапляліся ў метрычных кнігах мячэці ў Мураўшчызне.

У XX ст сярод прадстаўнікоў роду Ждановіч у м. Вішнева жыла дачка ластайскага муэдзіна Леона Александровіча – Аміня (1904 - 1992). Ейны муж – Алі Самуілавіч Ждановіч 1882 г.н. быў расстраляны падчас вайны. Мелі дзяцей Кярыма (1927 - 2002) і Галіну. Пасля смерці мужа Аміня Леонаўна выйшла замуж за Мустафу Ісмаілавіча Якубоўскага з Мінска, які жыў у Кярвелях і Немежы. Галіна жыла пэўны час у сваякоў па бацьку Ясінскіх ў в. Сорак татар, дзе была арыштаваная.

У 1851 годзе ў Вішневе жыло некалькі сем’яў Гямбіцкіх.

На 1887 год, паводле акту выбараў імама ў Даўбуцішках, у м. Вішнева жылі 9 татараў-гаспадароў. Гэта былі Шчуцкі Ібрагім, Ждановіч Сюляйман (сын вышэйзгаданага Давыда Сюляйманавіча), Сегадзінскі Хасень, Якубоўскі Магамет, Сафарэвіч Ілья, Гямбіцкі Давыд, Мураўскія Давыд і Мустафа і Асановіч Абрагам.

Іншымі татарскімі сем’ямі ў м. Зафінова былі Шчуцкія – Адам і Айша з Мураўскіх, іх сын Ібрагім і ўнук Аляксандр, які перабраўся ў Янушы. Таксама жылі прадстаўнікі роду Сегадзінскі, якія мелі сувязі з Іўем і Смілавічамі.

З Александровічаў ў Зафінова жыў Якуб Аляксандравіч (1893 - 1975), які прыехаў сюды з Койданава. Першай ягонай жонкай была Шарыфа (на помніку Серафіма) Бякіраўна з роду Александровіч (1893 - 1947) і дзеці – Ева Гямбіцкая, Алей, Сафія і Мяр’ема. Другая жонка – ўдава Ніяра Сцяпанаўна Лебедзь (Паўтаржыцкая) з Ласавічаў. Брат Якуба – Давыд – жыў ў Мінску, а сын Давыда Алей – у Іўі.

У м. Вішнева жылі бацькі Шарыфы – Бякір і Ева са Ждановічаў. Акрамя Шарыфы мелі яшчэ Іосіфа (1896 – 1971, пахаваны ў Олькавічах) ў Ашмянах, Хадзіджу (1912 – 1992) Александровіч (муж доктар Алей Александровіч з Дунілавічаў), Алея ў Ашмянах, Сюляймана (загінуў на Першай усясветнай вайне), Якуба.

Якуб Бякіравіч нарадзіўся ў 1904 годзе. Пазнаёміўся з сястрой свайго сябра Фэліцыяй Карэнька[109], з якой пабраўся шлюбам ў 1939 годзе ў Вільні. Якуб і Фэліцыя мелі дзяцей Зіну (1941 - 1996), Ніну (1943 - 1977) і Барыса. Падчас вайны Якуб, а таксама Сялім Гямбіцкі былі расстраляныя немцамі ў доме Сяліма ў Дзясятніках. Пасля вайны Фэліцыя працавала ў школьным буфеце, а потым пераехала з дзецьмі ў в. Сорак татар, дзе і пахаваная разам з дочкамі.

Сын Якуба і Шарыфы – Алей – нарадзіўся ў 1920 годзе яшчэ ў Койданаве, вучыўся з 1937 да 1939 у падафіцэрскай школе, затым трапіў на фронт і трапіў у палон да немцаў у 1939 годзе. Пасля вызвалення застаўся ў Германіі, працаваў у шахтах, а ў 1962 годзе вярнуўся ў Польшчу ў Беласток. Ажаніўся з Кібірай Мількамановіч са Слоніма, меў сына Багдана. На сённяшні дзень уся сям’я Алея пахаваная ў Багоніках. Што да сястры Евы, то ейным мужам стаў Адам Давыдавіч Гямбіцкі з Відзаў, а дзецьмі – Барыс (жыве ў Германіі) і Зіна. На сённяшні дзень у м. Зафінова жыве дачка Ніяры – Эмілія Якубаўна Лебедзь з дзецьмі і ўнукамі.

[109] Не была татаркай, але стала мусульманкай. Мела братоў у Канадзе і Польшчы.

У міжваенны час ў Вішневе пасяліліся Мейшутовічы. Самуіл Мустафавіч Мейшутовіч нарадзіўся на хутары пад Даўбуцішкамі, жыў пэўны час у Сяльцы і Мінску. Меў жонак Мяр'ему і Айшу Магаметаўну Якубоўскую, дзяцей Мустафу, Іосіфа, Еву, Зіну, Ліду, Мяр'ему, Аляксандра, Хасеня і Магамета. З іх толькі Зіна жыве ў Валожыне, а астатнія пераехалі ў Чалябінск, Польшчу, Уральск (Казахстан) і інш.

### *Дзясятнікі*

Адной з найбуйнейшых татарскіх сем'яў у Дзясятніках была сям'я Гямбіцкіх. Яны ж валодалі да вайны буйнымі зямельнымі надзеламі тут, а таксама ў Гальшанах і Багданаве.

Аляксандр Мустафавіч Гямбіцкі (1852 – 1932) з Гальшанаў меў каля 40 дзесяцінаў зямлі і два дамы ў Дзясятніках, быў кандыдатам на пасаду імама ў Даўбуцішках. Меў жонку Жанну Сялімаўну Лебедзь і дзяцей Сяліма (1880 - 1944)[110], Лявона (пахаваны на хр. могілках), Міхала (у Польшчы), Аўгіню Новікаву, Тамярлана і Сафію.

Сафія выйшла замуж за Сюляймана Мустафавіча Гямбіцкага з Мінску, мела дзяцей Рамана і Сямёна (1924 - 1997). Сафія працавала ў шпіталі ў Вішнева і падчас вайны ратавала габрэйскіх дзяцей, за што яе арыштавалі і закатавалі да смерці. Пасля гэтага Сюляйман ажаніўся другі раз – з Зінай Аляксандраўнай Паўтаржыцкай (Смольскай).

Міхал выехаў у Польшчу, дзе меў 2 сыноў. Ягоны ўнук Яцэк зараз сладае радавод сваёй сям'і.

Мужам Аўгіні быў уцякач з Расеі Новікаў, які ўжо меў дачку і быў маладзейшы за Аўгіню. Сварыўся са швагрnative і праз яго былі расстраляныя Сялім Гямбіцкі і Якуб Александровіч.

Лявон ажаніўся з Айшай Якубоўскай, меў дзяцей Тамару Варановіч у Гальшанах, Ніну ў Лідзе, Алу Басераву ў г. Коўна, Лілю Брахоўскую і Аляксандра.

Тамярлан ажаніўся з удавой Халімай Іосіфаўнай Рафаловіч з Іўя. Першы раз яна выйшла замуж у Іўі ў 1918 годзе за Амурата Сафарэвіча, які памёр у 1928. Тамярлан і Халіма дзяцей не мелі. Пасля смерці Тамярлана Халіма вярнулася назад у Іўе і жыла ў сям'і годжага Сюляймана Рафаловіча, свайго пляменніка. Брат Халімы, Сюляйман Рафаловіч, выехаў у ЗША, дзе да 1947 года быў імамам.

Сястра Аляксандра Мустафавіча – Гэлена (1865 - 1954) выйшла замуж за Хасеня Аляксандравіча Ільясевіча (1871 - 1938), мела дзяцей Мустафу ("Пушчаўскі", жыў у Самародніках, Іўі), Сафію Александровіч у Гальшанах і Аляксандра (пахаваны на Ліпаўцы пад Вільняй).

Іхны брат Якуб жыў у Багданаве, меў каля 20 дзесяцінаў зямлі пад Ашмянамі. Жонка – Мяр'ема, дзеці – Мустафа, Хасень у Немежы (ягоны сын Мустафа – імам у Свянцянах), Аляксандр (1905 – 1969, Немеж, пахаваны ў Іўі,

[110] Расстраляны немцамі.

нашчадкі ў Літве і Глыбокім), Эльміра Шчуцкая, Сафія Асановіч, Браніслаў. Якуб быў добры гарманіст, працаваў у Маладзечне на фабрыцы гармонікаў.

Сафія Асановіч з Гямбіцкіх мела мужа Сюляймана з Мядзела і сына Халіля. Халіль ажаніўся з Мяр'емай Аляксандраўнай Мейшутовіч з Сяльца, ад якой меў 4 сыноў. Халіль памёр у 2016 годзе і пахаваны ў Дзясятніках на мясцовых могілках.

Шабановічы ў Дзясятнікі перасяліліся з Іўя. Мустафа Ібрагімавіч Шабановіч (1936 - 1991) быў пляменнікам імаму з Мураўшчызны Мустафе Шабановічу. Меў жонку Азыму Адамаўну Ільясевіч (1925 – 1985) і дзяцей Іосіфа (1956 - 2003), Барыса, Тамару Абрамовіч і Зіну. Яшчэ адзін прадстаўнік роду Шабановіч – Давыд Халілявіч (1912 - 1987) меў жонку Азыму Самуілаўну Ільясевіч і дзяцей Рамана (1940 - 2002) ў Ашмянах і Самуіла. Давыд выконваў абавязкі муэдзіна ў Дзясятніках.

Міскевічы мелі карані з Мінску. Так, Сюляйман Магаметавіч Міскевіч (1913 - 1997) нарадзіўся ў Мінску ў сям'і чыгуначніка Магамета Сюляйманавіча Міскевіча (1884 – 1920) і Сафіі Адамаўны Гямбіцкай з Гонтаўшчыны (Гальшанаў) (1892 - 1979). Падчас Першай усясветнай вайны сям'я пераехала ў Крым, дзе ў іх нарадзілася дачка Тамара, а Магамет трапіў у войска. Пасля захопу паўвыспы бальшавікамі яго расстралялі 19 снежня 1920 года. Сафія з дзецьмі вярнулася ў Мінск да брата мужа - Адама, а потым у Гальшаны, дзе выйшла замуж другі раз за годжага з Іўя Бякіра Ібрагімавіча Радкевіча і нарадзіла дзяцей Браніслава, Еву Ільясевіч і Жанну Варановіч.

Што да Сюляймана Міскевіча, то ён ажаніўся ў Дзясятнікі з Гэленай Магаметаўнай Паўтаракевіч (1916 - 1997), бацька якой Магамет Іосіфавіч (1870 - 1944) быў родам з в. Сорак татар, пэўны час служыў у Мінску на чыгунцы, а затым набыў зямлю ў Дзясятніках. У Сюляймана і Гэлены дачка Ліля Дзейчман, якая жыве ў Мінску. Маці Гэлены была Хота Ібрагімаўна Шчуцкая (1891 - 1976).

Сястра Гэлены – Мяр'ема (1912 - 1988) – выйшла замуж за Мустафу Есьманавіча Хасяневіча (1898 - 1970) ў Дунілавічы, нарадзіла 3 сыноў, а пасля разводу жыла ў Дзясятніках з бацькамі, пакуль на бацькавай зямлі не пабудавалі ўласную хату. Дзеці Мяр'емы і Мустафы – Есьман (Ісман, 1932 - 1995), Мацей (1942 - 1993) і Алей.

Пэўны час у Дзясятніках жылі таксама Александровічы, Шчуцкія, Якубоўскія, Ільясевічы і інш. Такім чынам, у сярэдзіне XX ст. тут стала пражывалі больш за дзясятак татарскіх сем'яў. Мелі моцныя сувязі з Іўем, Гальшанамі, Крэвам і іншымі навакольнымі татарскімі паселішчамі. Памерлых хавалі на Ластаі, а рэлігійныя абавязкі выконвалі мясцовыя муэдзіны і годжыя. Так, у пасляваенны час вучыў і азаніў дзяцей вышэйзгаданы Давыд Халілявіч Шабановіч, а таксама Іосіф Якубоўскі.

Згаданы Іосіф Якубоўскі (1906 - 1973) паходзіў з Крэва, быў сынам Хасеня і меў брата Якуба і сёстраў Мяр'ему і Азыму. Іосіф меў жонку Тамару Якубаўну Якубоўскую, сястру вышэйзгаданай Сафіі Варановіч, і дачку Зіну.

Пасля смерці Іосіфа[111] Зіна забрала маці ў Літву, дзе яны былі пахаваныя ў Немежы на мізары.

Што да Якуба Якубоўскага, то ён жыў у Багданаве, меў мянушку "Літвячок" і знік падчас вайны. Жонка Якуба – Схоля Іванаўна Паўтаржыцкая з Кутоў, сын – Хасень. Пасля вайны жонка з сынам выехалі ў Немеж.

Сястра Іосіфа і Якуба, Мяр'ема, выйшла за Адама Аляксандравіча Ільясевіча (мянушка "Доська"), дачка – Азыма Шабановіч, жонка вышэйзгаданага Мустафы Ібрагімавіча.

Сястра Іосіфа, Якуба і Мяр'емы, Азыма, выйшла за Якуба Хасенявіча Гямбіцкага з Цярэшак. Жылі ў Ашмянах, дзе мелі дзяцей Ольгерда і Хасеня, які выехаў у Вільню.

***Паляны***

Чымбаевічы ў Паляны пераехалі з Новай Мышы. Так, Аляксандр Чымбаевіч ад жонкі Гэлены Мураўскай (ейная магіла адзіная захавалася на знішчаным мізары ў Палянах) меў сына Мустафу (1894 - 1979). Мустафа ажаніўся з Гэленай Аляксандраўнай Шчуцкай з Янушоў і меў дзяцей Эву, Леона і Аляксандра. Сын Эвы на сённяшні дзень валодае абсерваторыяй у Палянах.

Леон Чымбаевіч ажаніўся з Зінай Мустафаўнай Вврановіч, сям'я жыве ў Вытрапаўшчыне пад Маладзечнам. Маюць дачок Таццяну Александровіч у Сухаволі (Польшча) і Тамару Радлінскую.

Што да Гэлены Мураўскай, то яна ад першага мужа Магамета Якубоўскага мела сына Іосіфа (1908 - 1985), які жыў у Сяльцы і пахаваны ў Даўбуцішках.

У Палянах перад вайной пасяліліся 4 браты Шабановічы – Самуіл, Мустафа, Якуб і Алей, што былі родам з Іўя і Дзяляцічаў, Самуіл меў жонку Айшу Давыдаўну Радкевіч і дзяцей Сюляймана, Давыда і Аміню. Мустафа ажаніўся з Мяр'емай Аляксандраўнай Якубоўскай, і ў іх нарадзіліся Сюляйман, Сафія і Айша. Якуб ад жонкі Танзілі Мустафаўны нарадзіў Мустафу (былы старшыня парафіі ў Ашмянах), Самуіла, Сюляймана, Джамілю і Аляксандра. Алей ад жонкі Фацімы Аляксандраўны Шабановіч меў Сюляймана, Аміню і Аляксандра. Нашчадкі вышэйзгаданых Шабановічаў жывуць зараз у Ашмянах, Палянах, Маладзечне, Гродне, Літве і г.д.

***Загор'е***

У Загор'і жылі прадстаўнікі роду Варановіч. Так, чыноўнік Алей Бякіравіч Варановіч (1870 - 1918) быў унукам даўбуцішскага імама Варановіча. Пэўны час працаваў у г. Коўна, валодаў землямі ў Загор'і і Ласавічах. Ажаніўся ў 1902 годзе з Мяр'емай Самуілаўнай Шабановіч (1887 - 1964) з Іўя. Меў дзяцей Бякіра, Самуіла, Гэлену, Розу, Аміню і Мяр'ему. Падчас Першай усясветнай вайны сям'я трапіла ў эвакуацыю ў Казань, дзе Алей з сынам Бякірам памерлі і былі пахаваныя. Пасля 1921 года гаспадыня з дзецьмі вярнулася ў Загор'е. Пахаваная ў Іўі на мізары, а Мяр'ема і Гэлена на мізары ў Даўбуцішках. Роза

---

111 Пахаваны на Ластаі.

выйшла замуж за Якуба Фёдарава, жылі ў Маладзечне, дзе ў іх нарадзіліся Алег і Гера. Роза пахаваная пад прозвішчам Варановіч ў Іўі каля маці.

Самуіл Аляксандравіч Варановіч (1908 - 1960) пахаваны ў Даўбуцішках. Меў жонку Аміню і дзяцей Іосіфа ў Паставах, Адама і Аляксандра ў Маскве.

***Сялец***

Землі ў Сяльцы ўваходзілі ў склад маёнтка Баўбатава, які належаў Крычынскім, у тым ліку і Алею Самуілавічу Крычынскаму, муцівілю Віленскай мячэці ў канцы XIX ст, а затым ягоным нашчадкам.

У гістарычных крыніцах у пачатку XIX ст. у Сяльцы згадваюцца татары Мейшутовічы, а яшчэ раней – Сулькевічы і Сялецкія.

Мейшутовіч Ібрагім Іосіфавіч, продкі якога валодалі землямі на Ластаі і ў м. Крэва, набыў надзел ў Сяльцы ў 20 дзесяцінаў ў 1836 годзе. Ён меў жонку Мяр'ему з Базарэвічаў і дзяцей Мустафу, Амурата і Халіля. Амурат (1822 - 1888) ад жонак Фуршы з Якубоўскіх і Айшы меў дзяцей Мустафу, Аляксандра, Іосіфа і Якуба. Мустафа Ібрагімавіч ад Алены Крыніцкай нарадзіў Іосіфа, Адама, Самуіла[112] і Амурата. Адам і Іосіф перасяліліся ў Мінск, дзе і зараз жывуць іхныя нашчадкі. Унук Іосіфа, Аляксандр Адамавіч Мейшутовіч, ажаніўся з Эльмірай Амуратаўнай Якубоўскай з Ашмянаў (Крэва).

У XX ст. у Сяльцы жылі прадстаўнікі родаў Гямбіцкі, Мураўскі, Мухарскі і Якубоўскі. Так, Іосіф Магаметавіч Якубоўскі (1908 - 1985), пахаваны ў Даўбуцішках, меў жонку Тамару Іосіфаўну (1905 - 1987) і дачок Дзіну Гямбіцкую ў Вільні і Джамілю (1932 - 2000).

Тамара мела яшчэ першага мужа Хасеня Білялевіча Мураўскага і дзяцей Сабіру (1927 - 1942) і Эльміру Рафаловіч ў Іўі. У Сяльцы жыла таксама сястра Тамары - Фаціма Мухарская з мужам Сюляйманам Аляксандравічам Мухарскім і дачкой Сафіяй.

***Ашмяны***

Нягледзячы на тое, што Ашмяны былі цэнтрам павету з найбольшай колькасцю татарскіх паселішчаў, у самім мястэчку татараў было няшмат. Працавалі яны ў асноўным ува ўстановах мястэчка – судах, паліцыі, скарбовых палатах і г.д. Масава яны сталі перасяляцца сюды ў XX ст. Так, на вуліцы Горнай, Барунскай, Гальшанскай і інш. з'явіліся сем'і Якубоўскіх, Паўтаржыцкіх, Гямбіцкіх, Мухарскіх, Шабановічаў, Хасяневічаў[113], Александровічаў, Рызвановічаў, Радкевічаў, Радлінскіх, Радзецкіх і інш. Займаліся гарбарствам і агародніцтвам.

---

[112] Згадваўся вышэй у Вішневе, а нашчадкі ў Казахстане.
[113] Паходзілі са Смілавічаў

У 1834 годзе у Ашмянах згадваецца сям'я ўдаўца Гямбіцкага Аляксандра Сюляйманавіча (45), які арандаваў там зямлю. Гэта сам гаспадар і дзеці Азюль (21), Мустафа (12), Ісак (8), Аніфа, Хадзя, Айша, Мяр'ема, Сафія, Асэя, Алена.

Сям'я Радкевічаў – Мустафа Ібрагімавіч і Каліманa Якубаўна з Радлінскіх пераехалі ў Ашмяны з Ільянова пасля вайны. Жылі на вул. Кірава. Дзеці – Якуб (1930 - 1985), Роза (1933 - 2007), Сюляйман (1935), Аміня (1930 - 2007). Аміня была апошняй уладальніцай хаты і перадала яе парафіі. Зараз тут малітоўны дом.

***Радашковічы***

У Радашковічах жылі сем'і Якубоўскіх, Радкевічаў і Шчансновічаў. Хавалі памерлых у Мінску і Даўбуцішках.

Адам Якубоўскі меў дачку Азыму Міхайлаву і сына Хасеня, пахаваных ў Мінску на мізары. Ад першай жонкі Схолі Аляксандраўны з Якубоўскіх Хасень меў дзяцей Халіму Мейшутовіч (1925 - 2002) у Мінску і Вільні і Розу ў Польшчы. Ад другой жонкі Розы Мустафаўны Шчансновіч з Леанполя (1911 - 1993[114]) дзяцей Аміню Фёдараву (1948 - 1991[115]), Аўгіню (1952 - 2009), Зіну, Давыда ў Негарэлым, Ібрагіма ў Вілейцы і Рамана ў Іўі.

Тут жыў Сюляйман Шчансновіч (1893 - 1951) з Леанполя, брат Розы Якубоўскай. Меў жонку Фаціму Самуілаўну Шчуцкую з Іўя і сына Мустафу. Мустафа быў жанаты першым шлюбам з Аміняй Іосіфаўнай Міскевіч з Іўя, меў сына Якуба.

Вышэйзгаданая Схоля была дачкой Аляксандра Якубоўскага з Радашковічаў. Мела братоў Мустафу, Якуба, што выехаў ува Ўкраіну, і Магамета (1911 - 1943), што загінуў на вайне.

У Радашковічах у пасляваенны час жылі Радкевічы з Даўбуцішак – Ях'я Давыдавіч і Мяр'ема Сюляйманаўна з Рафаловічаў з Іўя. Дзеці – Джаміль, Фарыда, Раман, Заіра і Аляксандр, якія часткова пераехалі ў Іўе.

[114] Пахаваная ў Даўбуцішках
[115] Пахаваная ў Даўбуцішках, нявестка Розы Аляксандраўны Фёдаравай (Варановіч).




Lietuvos
valstybės
istorijos
archyvas


Lietuvos
valstybės
istorijos
archyvas


Lietuvos
valstybės
istorijos
archyvas


Lietuvos
valstybės
istorijos
archyvas








97. Фрагмент интерьера Довбучской мечети.















Кніга памяць. Даўбуцішкі

Аўтар Сяргей Міскевіч. Навуковы супрацоўнік Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта. Даследчык татарскай генеалогіі, гісторыі і некрапалістыкі.

Наклад 200 асобнікаў.

Мінск, 2021.